

ЦІ Ў ГРАШАХ ШЧАСЦЕ?

Сямейная газета

ЧАМУ ПАВУЧЫЦЦА Ў ЯЎРЭЙСКІХ СЕМ'ЯЎ?

Сямейная газета




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 МАЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 84 (29453)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Святлана АЛЕЙНІКАВА, аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў, кандыдат сацыялагічных навук:**

*«Калі казаць у цэлым аб гістарычнай памяці беларускага грамадства, то яна досыць роўная і адрозніваецца тым, што няма этапаў, якія б адмаўляліся, як у многіх постсавецкіх краінах, але і няма сакралізацыі нейкіх этапаў. Цэнтральнае месца ў гістарычнай памяці беларускага грамадства займае Вялікая Айчынная вайна. Гэта пацвярджаюць усе сацыялагічныя замеры. Вайна ўспрымаецца беларусамі, па-першае, як перамога і ўклад беларускага народа ў агульную перамогу — гэта прадмет нацыянальнага гонару сучаснага беларускага грамадства. Акрамя таго, перамога ўспрымаецца як трагедыя, як велізарная ахвяра беларускага і савецкага народа».*

# ПРЫРОДА НАТХНЕННЯ



Мазыранін Аляксандр ЗЯНЬКО — асоба надзвычай пазітыўная і крэатыўная. У сваім горадзе і раёне ён вядомы найперш як разьбяр па дрэве, а яго асноўны мастакоўскі «разец» — бензапіла. Унікальнасць творцы ў тым, што ён на хаду прыдумляе кампазіцыі і тут жа даводзіць сваю задуму да лагічнага завяршэння. Скульптурамі звяроў і птушак, малымі архітэктурнымі формамі — лаўкамі, садовай мэбляй — ён упрыгожвае тэрыторыі лясніцтваў Мазырскага доследнага лясгаса, скверы горада. Па кампазіцыі і апрацоўцы дрэва творчая рука майстра пазнаецца лёгка і адразу.

Аляксандр Зянько родам з вёскі Кіраў Нараўлянскага раёна. Былы школьны настаўнік працы, працаваў у сельскім Савеце. І вось тры гады шчыруе ў вядомым на Палессі лясгасе, дае іншым майстар-класы, а цяпер выпілоўвае чарговую партыю скульптур фаўны для Міхалькаўскага лясніцтва.

Я даўно хацеў паказаць работы гэтага майстра. Іх можна паглядзець на нашым сайце zviazda.by.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Знойдзены ў ізраільскай пустыні ордэн вярнуўся сям'і ветэрана ў Беларусі.**
- Саюз юрыстаў далучыўся да акцыі па бясплатным кансультаванні да Дня Перамогі.
- **МАЗ перадаў Мінску і абласным цэнтрам першыя электробусы.**



- У гродзенскім Старым замку археолагі выявілі падлогу XVI стагоддзя.
- **Грамадскі транспарт Мінска на Радаўніцу будзе працаваць ва ўзмоцненым рэжыме ўсе чатыры выхадныя дні.**


ISSN 1990 — 763X


# КОЛЕР, ЯКІ НАС ЯДНАЕ

**У Дзень Вялікай Перамогі, 9 Мая, у Магілёве адкрыецца крама дзяржаўнай сімволікі**



**Сёлета важная для кожнага беларуса дата супадае з яшчэ адной таксама значнай і патрыятычнай — Днём сцяга і герба, якія адзначаецца ў другую нядзелю мая. На ўсенародным рэферэндуме ў 1995 годзе за цяперашні дзяржаўны сцяг і герб прагаласавала болей чым 75 % беларусаў. У святле апошніх падзей чырвона-зялёны колер набыў яшчэ больш моцнае гучанне. Ён стаў не толькі знакам міру і стабільнасці, але і сімвалам яднання.**

СТАР. 3

Сямейныя гісторыі

# «ВОСЬ АТРЫМАЕМ ПЕРАМОГУ, І Я ВЯРНУСЯ ДАМОЎ...»

**Карэспандэнт «Звязды» адшукала франтавыя пісьмы свайго бацькі. Гісторыя мела працяг**

**Атрымалася, як з тым клубком: пацягнуў за нітку, а ён усё больш і больш разматваецца. А пачалося ўсё з франтавых пісьмаў, якія больш за 70 гадоў праляжалі ў старым куфары. Калі вырашыла аб гэтым напісаць, на вочы трапіў зборнік «Партызанскі край», які склалі школьнікі-пошукавікі па расказах відавочцаў. Пагартаўшы, знайшла там аповед пра свайго дзеда і маці. Яны выходжвалі параненага чырвонаармейца. Больш за тое, у партызанскім атрадзе знаходзіўся і мой бацька, 16-гадовы юнак Сяргей Ушкевіч.**



## Гісторыя першая

Мае раннія ўяўленні аб вайне звязаныя менавіта з бацькам. Нам з сястрой у дзяцінстве дазвалялі гуляць з татавымі ваеннымі ўзнагародамі. Што мы разумелі? Толькі тое, што тата быў на фронце, а як і дзе — з прычыны ўзросту не ведалі. Затое памятаю, як на 9 Мая мы з бацькам ездзілі ў суседнюю вёску, якая была спалена немцамі. А ў мірны час там ладзілі святочны фэст.

СТАР. 4

# СУСТРЭЧА ПА-СЯБРОЎСКУ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нефармальную сустрэчу са старшынёй партыі сацыялістаў Рэспублікі Малдова, экс-прэзідэнтам гэтай краіны Ігарам Дадонам. Пра гэта паведамляе БелТА.**

Нягледзячы на нефармальны фармат сустрэчы, размова ішла і на сур'ёзныя злабадзённыя тэмы. Малдаўскі госць падчас размовы звярнуўся да абстаноўкі ў Беларусі і вакол яе. «Добра, што ўтрымалі сітуацыю, — сказаў ён. — Вы малайцы! Такі ціск!» Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што трэба паважаць саміх сябе і жорстка адстойваць свае інтарэсы: «Хоць мы і невялікія, але і не карлікавыя. У нас людзі, народ, якія павінны ў рэшце рэшт паважаць самі сябе. Народ павінен жыць як след, забяспечыць гэтае жыццё».

Аляксандр Лукашэнка падрабязна распавёў Ігару Дадону аб пазіцыі ў Беларусі ў дачыненні да санкцый, якімі пагражаюць заходнія краіны. Пры гэтым ён выказаў упэўненасць, што атрымаецца пераадолець тыя ці іншыя бягучыя цяжкасці.

Каментуючы сітуацыю са спробай замаху і дзяржперавароту, беларускі лідар быў катэгарычны: «Мы не баімся, што яны там нешта думаюць. Мы проста трэці раз даём зразумець: хлопцы, спыніцеся, таму што мы адкажам, і вельмі-вельмі жорстка! Яны ўжо перайшлі чырвоную лінію. Як толькі яны падыдуць да вяршыні, яны атрымаюць вельмі моцны адпор».

Падчас сустрэчы абмяркоўваліся не толькі вострыя каляпалітычныя тэмы. Размова ішла і аб зямным: як і дзякуючы чаму ўмацоўваць дабрабыт, развіваць эканоміку дзвюх краін.

## Парламенцкі дзённік

# ЁСЦЬ НАД ЧЫМ ПРАЦАВАЦЬ

**Спікеры верхняй і ніжняй палат беларускага парламента Наталля Качанава і Уладзімір Андрэйчанка сустрэліся са старшынёй парламента Малдовы Зінаідай Грачаный.**

Уладзімір Андрэйчанка адзначыў моцную дагаворна-прававую базу, на якой грунтуецца ўзаемадзеянне і супрацоўніцтва нашых дзяржаў у міжнародных арганізацыях. Ён звярнуў увагу, што візіт парламенцкай дэлегацыі Малдовы прыйшоўся на падрыхтоўку да святкавання Дня Перамогі, а ў Беларусі асабліва аддаюць даніну памяці загінулым. З такой нагоды прадстаўнікі Малдовы прымуць удзел у адкрыцці помніка свайму земляку, Герою СССР Іону Солтысу і закладуць у крыпце Храма-помніка Усім Святым капсулу з зямлёй з брацкіх пахаванняў воінаў-малдаван, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў.

«Гэта вельмі важна і для вас, і для нас, бо час зараз мы перажываем няпросты. Вы бачыце, колькі спроб перапісаць гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Мы лічым, што павінны адзіным фронтам супрацьстаяць фальсіфікацыі гісторыі, рэабілітацыі нацызму», — сказаў спікер ніжняй палаты парламента.

Уладзімір Андрэйчанка прапанаваў сумесна прасоўваць гэтую тэму на міжнародных парламенцкіх пляцоўках і выказаў спадзяванне на падтрымку малдаўскіх калег у Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы.

Ён таксама падкрэсліў, што нядрэнна складваецца таваразварот і за 2020 год склаў больш чым 200 мільёнаў долараў. За два месяцы сёлета рост у 23 % у параўнанні з аналагічным перыядам летась.

«Парламентарыі Рэспублікі Беларусь і далей маюць намер у такім плане рухацца і развіваць супрацоўніцтва, узмацняць сяброўства з вашай краінай і народам», — заявіў Уладзімір Андрэйчанка.

Прывітанне ад Савета Рэспублікі дэлегацыі Малдовы выказала і старшыня верхняй палаты парламента Наталля Качанава. Яна адзначыла, што вельмі важна парламентарыям розных краін размаўляць і чуць адзін аднаго.

«Калі мы робім заявы і нас не чуюць — гэта дрэнна, калі інфармацыю чэрпаюць з іншых крыніц — гэта няправільна. Мы жывём у гэтай краіне і бачым, як жывуць людзі. Вы разумееце ролю дэпутацкага корпуса. Вельмі важна, каб вы сёння ўбачылі і пачулі, што адбываецца ў нашай краіне», — сказала Наталля Качанава.

Па яе словах, добрыя адносіны складваюцца і ў гуманітарных сувязях дзвюх краін, супрацоўнічаюць дзяржавы ў сферы адукацыі, працуюць над прызнаннем дакументаў аб адукацыі, падпісана пагадненне аб сацыяльным забеспячэнні.

Спікер верхняй палаты парламента прапанавала актывізаваць узаемадзеянне жаночых арганізацый, маладзёжных груп.

«Патэнцыял узаемадзеяння парламентарыяў Беларусі і Малдовы велізарны, сур'ёзны, нам ёсць над чым працаваць», — канстатавала Наталля Качанава.

Кіраўнік малдаўскай парламенцкай дэлегацыі Зінаіда Грачаный паведаміла, што яе краіна ўваходзіць у выбарчую кампанію. На 11 ліпеня назначаны датэрміновыя парламенцкія выбары. Але гэта, па словах старшыні парламента Малдовы, не павінна перашкодзіць супрацоўніцтву.

У заяве для журналістаў Уладзімір Андрэйчанка расказаў, што вынікі сустрэчы пацвердзілі наяўнасць шматлікіх магчымасцяў для развіцця супрацоўніцтва ў эканамічнай, палітычнай сферах.

«Я ўпэўнены, што парламентарыі маюць намер больш актыўна ўдзельнічаць у рабоце міжурадавых структур, больш актыўна развіваць супрацоўніцтва рэгіёнаў і гарадоў-пабрацімаў. Мы дамовіліся, што асаблівую ўвагу нам трэба ўдзяліць пытанню нашага ўзаемадзеяння ў міжнародных парламенцкіх арганізацыях з мэтай прасоўвання нашых рэзалюцый», — рэзюмаваў спікер Палаты прадстаўнікоў.

Наталля Качанава, Уладзімір Андрэйчанка і Зінаіда Грачаный у канцы сустрэчы падпісалі сумесную заяву аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Беларусі і парламентам Малдовы.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**Мікалай ШАРСНЁЎ:**

# «Фестываль адбудзецца ў любым выпадку»

## Кіраўнік Віцебшчыны адказаў на пытанні журналістаў і жыхароў вобласці

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў учора адказаў на пытанні прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі пасля таго, як павіншаваў іх з Днём друку. Упершыню на традыцыйнай прэс-канферэнцыі да кіраўніка рэгіёна звярнуліся не толькі журналісты. Праз відэазапіс свае пытанні задалі і звычайныя жыхары паўночнай вобласці.**

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама падчас прэс-канферэнцыі расказаў пра юбілейны «Базар», спадарожнікавае земляробства, будучы праспект і іншае, што хвалюе многіх землякоў і не толькі.**


Фота БелТА.

У прыватнасці, што датычыцца шуміхі вакол трыццатага «Славянскага базару ў Віцебску», Мікалай Шарснёў сказаў, што гэты праект навучыў праводзіць любыя маштабныя мерапрыемствы, гэта важна і для горада, і для вобласці. Прадстаўнікі каля васьмідзесяці краін свету прыязджалі ў Віцебск — такая геаграфія фестывалю. Мясцовая ўлада імкнецца паказаць усю прыгажосць абласной сталіцы. За дзесяцігоддзі «Базару» ў Віцебску адкрылі нямала гатэляў, кавярняў, музеяў і іншых аб'ектаў. Кіраўнік выканаўчай вертыкалі ўпэўнены, што свята павышае культуру ва ўсіх сэнсах: ад паводзін гараджан да віцебскіх артыстаў, якія выступаюць разам з зоркамі. Нагадаў, што летась афіцыйная праграма фестывалю доўжылася толькі тры дні, і сёлета ён будзе параўнальна нямаштабным, але ад гэтага ён якасць не пагоршыцца. Фестываль адбудзецца ў любым выпадку, канстатаваў губернатар. Гісторыя вакол «Базару» не перашкодзіць планам арганізатараў. Многія вядомыя артысты шчасліва сюды прыехаць. Пастаянныя ўдзельнікі ганарацца тым, што іх запрашаюць зноў у Віцебск.

Некалькі пытанняў датычылася сельскагаспадарчай галіны. Напрыклад, наконт сучасных метадаў апрацоўкі зямлі. Мікалай Шарснёў нагадаў, што многае зроблена для скарачэння стратных гаспадарак. Стварэнне сямі аграрных холдынгаў на Віцебшчыне было правільным рашэннем, упэўнены ён. У выніку цэнтралізавана можна закупляць магутную сельскагаспадарчую тэхніку, вырашаць кадравыя праблемы, арганізоўваць вытворчасць па прынцыпе «ад поля да прылаўка». І для такіх структур ужо не будзе цудам, калі камбайн кіруецца пры дапамозе спадарожнікавага штурмана. Падрыхтоўчая работа для кропкавага земляробства — задача не танная, але яна дазволіць максімальна эфектыўна праводзіць сяўбу і жніво. У выніку можна аптымізаваць выдаткі, эканомія паліва складзе 15-20 %. Губернатар лічыць, што падчас бягучай пяцігодкі ўжо будзе нямала прыкладаў такой эфектыўнай працы на зямлі. І сёння ў Віцебскім раёне адна з гаспадарак ужо можа падзяліцца падобным вопытам.

Пацікавіліся журналісты і тэмай вакцынацыі. Вакцынацыя неабходная, упэўнены кіраўнік рэгіёна.

Ад жыхароў Віцебшчыны было тры пытанні. У прыватнасці, віцяблянка прапанавала перайменаваць вуліцу Гагарына, дзе да пачатку фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» будзе завершана маштабная рэканструкцыя, у праспект імя першага касманаўта Савецкага Саюза Ю. А. Гагарына. Папрасіла зрабіць на будучым праспекце міні-поле для гульняў у футбол, дзіцячыя пляцоўкі і іншыя аб'екты грамадскага прызначэння. Мікалай Шарснёў расказаў, што пасля рэканструкцыі праезнай часткі праект прывяздення ў парадак вуліцы будзе рэалізаваны на працягу некалькіх гадоў. Тады ўжо можна будзе весці гутарку наконт новай назвы.

Адказваючы на пытанне жыхаркі Бешанковіцкага раёна, кіраўнік рэгіёна растлумачыў, чаму закрываюцца малакамплектныя школы: гэта дазваляе сканцэнтраваць фінансавыя сродкі і добрыя кадры, каб забяспечыць дзяцей больш якаснымі паслугамі.

Старшыня аблвыканкама пракаментаваў пытанне жыхаркі вобласці наконт работы сістэмы ЖКГ. Ён лічыць, што прыватнікі маглі б узяць на сябе частку камунальных паслуг, напрыклад, прыбіранне смецця.

Наконт асабістага блога ў сацыяльных сетках, у прыватнасці ў Instagram, каб быць на сувязі з народам, Мікалай Шарснёў адказаў, што фізічна не паспее якасна падаваць матэрыял, адказваць на пытанні і чытаць каментарыі. Па электроннай пошце ў аблвыканкам могуць звяртацца ўсе ахвотныя, нагадаў ён і запэўніў, што трымае на асабістым кантролі ўсе лісты са слушнымі заўвагамі.

Кіраўнікам раённага, сельскага ўзроўняў ён параіў выкарыстоўваць сучасныя магчымасці інтэрнэт-стасункаў з людзьмі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэзідэнт Кыргызстана падпісаў новую Канстытуцыю



Садыр Жапараў падпісаў новую Канстытуцыю ў адпаведнасці з афіцыйнымі вынікамі рэферэндуму, які адбыўся 11 красавіка, паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы. «Новая Канстытуцыя напісана з улікам менавіта тых выклікаў, што актуальныя для нашай краіны, яна адлюстроўвае каштоўнасці, якія мы шануем як народ, і ідэалы, да якіх мы імкнёмся як грамадства», — сказаў Жапараў у віншаванні з нагоды Дня Канстытуцыі краіны. Ён дадаў, што ўпэўнены ў тым, што Асноўны закон «будзе паспяхова служыць інтарэсам народа і спрыяць далейшаму эфектыўнаму развіццю Кыргызстана». На рэферэндуме новую Канстытуцыю падтрымала 79,3 працэнта выбаршчыкаў. Яна прадугледжвае пераход да прэзідэнцкай формы кіравання і шэраг іншых змен, звязаных з арганізацыяй сістэмы ўлады ў краіне, у тым ліку скарачэнне колькасці дэпутатаў парламента з цяперашніх 120 да 90.

## Брытанцы падчас пандэміі назапасілі на банкаўскіх дэпазітах 200 млрд фунтаў



Брытанскія сем'і назапасілі на банкаўскіх дэпазітах каля 200 мільярдаў фунтаў стэрлінгаў ($278 млрд) з пачатку пандэміі каранавіруса ў сакавіку 2020 года, сведчаць даныя Банка Англіі. Даходы брытанцаў у асноўным захаваліся дзякуючы дзяржаўным праграмам падтрымкі эканомікі, у той час як магчымасці для расходавання сродкаў рэзка зменшыліся з-за лакдаўнаў, адзначыла газета Financial Times. Буйныя збярэжанні могуць падтрымаць эканамічны ўздым у Вялікабрытаніі, калі абмежавальныя меры, уведзеныя ў сувязі з COVID-19, будуць цалкам зняты, адзначаюць эксперты. Аб'ём сродкаў на банкаўскіх дэпазітах брытанцаў у сакавіку павялічыўся на 16,2 млрд фунтаў. Чысты аб'ём прыцягнутых іпатэчных крэдытаў у сакавіку склаў 11,8 млрд фунтаў, што з'яўляецца максімумам з пачатку адсочвання брытанскім Цэнтрабанкам гэтых даных у красавіку 1993 года.

## У Еўропе прайшлі паліцэйскія рэйды супраць італьянскай мафіі




Буйная міжнародная спецаперацыя супраць мафіёзнай групоўкі «Ндрангета» прайшла ў Італіі, Германіі, Румыніі і Іспаніі, паведамілі еўрапейскія СМІ. Рэйды паліцыі былі накіраваны на барацьбу з наркагандлем. Паводле заявы італьянскай пракуратуры, вартавыя парадку падчас ператрусаў канфіскавалі мільёны еўра. Спецаперацыяй кіравала пракуратура ў Турыне, у ёй задзейнічалі некалькі сотняў паліцэйскіх у чатырох краінах. Як вядома, калабрыйскі мафіёзны сіндыкат «Ндрангета» быў заснаваны ў 1897 годзе. Ён дзейнічае не толькі ў Італіі і лічыцца адным з самых уплывовых у свеце, у яго радах — каля 10 тысяч членаў. Адной з асаблівасцяў, з-за якіх, як лічыцца, супраць «Ндрангеты» складана змагацца, з'яўляецца дэцэнтралізацыя. У адрозненне ад сіцылійскай «Коза ностры», у яе менш жорсткая сістэма іерархіі, і кіраўнікі невялікіх мафіёзных «сем'яў», якія ўваходзяць у яе, маюць значную аўтаномію ў прыняцці рашэнняў. У выніку нават у выпадку арышту часткі верхаводаў «Ндрангета» ўсё роўна здольная працягваць функцыянаваць.

# КОЛЕР, ЯКІ НАС ЯДНАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Крама дзяржаўнай сімволікі адкрываецца ў сценах былой кнігарні «Раніца» прадпрыемства «Магілёўсаюздрук» на праспекце Міру. Прэзентацыя яшчэ наперадзе, але ў якасці азнаямлення карэспандэнту «Звязды» з імі і асацыюецца дзяржаўная сімволіка нашай суверэннай незалежнай краіны. Гэта тыя скрэпы, якія аб'ядноўваюць нас усіх разам і вакол кіраўніка дзяржавы. Беларускую сімволіку трэба ведаць, умець у ёй разбірацца.

Невыпадкова для крамы дзяржаўнай сімволікі ў Магілёве



паказалі, як прыблізна ўсё будзе выглядаць. З парога адразу ж трапляеш у атмасферу дзяржаўнасці і ўрачыстасці. На палічках сур'ёзныя кнігі, маляўнічыя альбомы з беларускімі краявідамі, сувенірная прадукцыя, якая прадстаўляе краіну ў цэлым і рэгіён у прыватнасці, мелкая пластыка, лялькі ў беларускіх строях, дзяржаўныя СМІ.

— У нашай краме шырока прадстаўлены кнігі вядучых беларускіх выдаўцоў, у тым ліку такіх аўтарытэтных, як Выдавецтва «Беларусь», Выдавецкі дом «Звязда», Выдавецкі дом «Беларуская навука», — звяртае ўвагу **вядучы таваравед Вольга ЛАМАКІНА.**

Яна расказвае, што крама была перафарматавана за вельмі кароткі час. І пастаянныя пакупнікі ўжо з цікавасцю чакаюць яе адкрыцця.

— Стварэнне такога аб'екта — патрабаванне часу, — перакананы **дырэктар «Магілёўсаюздруку» Алена КОТАВА.** — Мы пайшлі насустрач зваротам жыхароў, працоўных калектываў Магілёва і вобласці. Узнікла неабходнасць сканцэнтраваць усю прадукцыю, звязаную з дзяржаўнай сімволікай, пад адным дахам. І мы паклапаціліся пра тое, каб тут быў найбольш поўны асартымент. Пакуль гэта адзіная падобная крама ў краіне.

Алена Котава сведчыць, што апошнім часам стала прыкметна расці цікавасць да беларускіх выданняў. За мінулы год у параўнанні з папярэднім рэалізацыя такой літаратуры вырасла да 150 %. Прадпрыемства клапоціцца, каб усе апошнія кніжныя навінкі былі прадстаўлены ў яго гандлёвай сетцы. У краме дзяржаўнай сімволікі будзе магчымасць купіць высокамастацкія кнігі пра мінулае і сучаснае Беларусі, краязнаўчую літаратуру, падарункавыя выданні.

— Гораду проста не хапала такой пляцоўкі, — перакананa **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Кацярына МУЗЫЧЭНКА.** — Найлепшымі якасцямі беларускага грамадзяніна заўсёды лічыліся працавітасць, прыстойнасць, патрыятызм. Менавіта выбрана цэнтральнае месца. Па дыяганалі праз падземны пераход яна суседнічае з Домам Саветаў — месца, добра вядомае не толькі жыхарам горада, але і вобласці. Не прыйдзецца блукаць і замежным гасцям. Тут усё побач. Не выключана, што ў будучыні крама будзе ўдасканальвацца, з'явяцца новыя паслугі. Напрыклад, магчымасць нанесці на прадметы і адзенне прынт з дзяржаўнай сімволікай.

— Функцыя сімволікі — аб'ядноўваць, і наша задача — паклапаціцца пра тое, каб гэтыя сімвалы прысутнічалі ў нашым жыцці, — адзначае **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.** — Гэта не толькі прапаганда гімна і сцяга, але і тыя візуальныя сімвалы, якія павінны аб'ядноўваць людзей вакол Прэзідэнта, дзеючай улады, у рэшце рэшт візуалізаваць сілу народа. Імі трэба напаўняць грамадскую прастору, выкарыстоўваць пры правядзенні грамадска-палітычных мерапрыемстваў. Дзяржаўная сімволіка будзе да месца і на кепцы, і на фуфайцы, і на школьным дзённіку. Гэта тое, што робіць нас мацней, тыя правілы, па якіх мы сёння жывём і якія прыняла большасць. Трэба падняць гістарычную важнасць дзяржаўнай сімволікі на новы больш высокі ўзровень. Мы павінны мець магчымасць набыць не толькі герб або сцяг, але і эталон дзяржаўнага гімна. І менавіта гэта версія павінна выкарыстоўвацца на палітычных мерапрыемствах. Мы робім гэтую краму не толькі для людзей, якія цікавяцца дзяржаўнымі сімваламі, але і для шырокай грамадскасці, якая зможа набыць там кнігу або перыядычнае выданне, замовіць сувенір з беларускай сімволікай. А яшчэ, калі рыхтавалі краму да адкрыцця, звярнулі ўвагу, што нашы выдавецтвы прыпынілі выданне сувенірных кніг. Калісьці я купіў некалькі маленькіх томікаў Багдановіча на падарунак у Маскву. І тыя некалькі камплектаў разышліся ў імгненне. А калісьці гартаў томік Якуба Коласа, перакладзены на англійскую мову. І гэта таксама было цудоўна. Трэба такія традыцыі працягваць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# АРГУМЕНТАВАНА І ЦВЁРДА АДСТОЙВАЦЬ ІНТАРЭСЫ БЕЛАРУСІ

**Аляксандр Лукашэнка павіншаваў супрацоўнікаў сферы інфармацыі і сувязі з Днём друку і Днём работнікаў радыё, тэлебачання і сувязі.**

— Дзякуючы высокаму прафесіяналізму беларускіх журналістаў, выдаўцоў, паліграфістаў і сувязістаў у краіне створаны і даступны кожнаму якасны і дакладны кантэнт, які дазваляе людзям аб'ектыўна ацэньваць рэаліі сённяшняга жыцця. Распавядаючы пра падзеі ў краіне і свеце, рэалізоўваючы актуальныя грамадска-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя, творчыя праекты, вы ствараеце эмацыянальны фон і фарміруеце палітычную культуру ў грамадстве, — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што шмат у чым ад грамадзянскай пазіцыі работнікаў гэтай сферы, умення ва ўмовах інфармацыйнага прэсінгу аргументавана і цвёрда адстойваць інтарэсы Беларусі залежыць непахіснасць спрадвечных каштоўнасцяў народа, традыцый і дзяржаўнага суверэнітэту.

— Перакананы, што ў Год народнага адзінства вашы талент і крэатыўнасць, кампетэнтнасць і аддансць справе будуць служыць высакароднай місіі ўмацавання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў — усеагульнаму гонару за гераічнае мінулае і здзяйсненні папярэдніх пакаленняў, пачуцця прыналежнасці кожнага да дасягненняў сучаснасці, усведамлення асабістай адказнасці за будучыню роднай зямлі, — падкрэсліў Прэзідэнт.

Медыяпрастора

# ДзяржСМІ: адказваючы за кожнае слова

**Каб абмеркаваць тэндэнцыі ў сучаснай журналістыцы ў Дзень друку сустрэліся прадстаўнікі журналісцкага асяроддзя і парламентарыі.**

— Прафесія журналіста заўсёды была значная для грамадскасці. З цягам часу яна мяняла свае фарматы, і сёння можна сказаць пра тое, што інфармацыйная прастора зусім новая, таму і фарматы журналісцкай работы патрабуюць змен, — упэўнена **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын Лілія АНАНІЧ.** — Але разам з тым нам усім трэба спыніцца і рабіць тое, пра што мала хто задумваецца: вяртацца і ўмацоўваць друкаванае слова, каштоўнасці друкаванай прэсы. Журналістыка — гэта люстэрка нашай рэчаіснасці. Дзяржаўныя СМІ заўсёды працавалі ў рамках закона і адказвалі за кожнае слова, ніколі не дазвалялі сабе даваць неправераныя факты. Безумоўна, і для журналістаў важная падтрымка з боку заканадаўства. Можна сказаць, што ў Дзень друку мы зрабілі заканадаўчы падарунак інфармацыйнай прасторы — Міністэрства інфармацыі сумесна з Пастаяннай камісіяй па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ, з прафесійнай журналісцкай супольнасцю падрыхтавалі законапраект, які ў хуткім часе будзе падпісаны кіраўніком дзяржавы і стане рэгулюючым асноватворным дакументам у гэтай сферы.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Генадзь ДАВЫДЗЬКА** дадаў, што трэба зрабіць так, каб заканадаўства ў дадзенай сферы павышала адказнасць інфармаванага насельніцтва. «Улада ў першую чаргу — гэта павышаная інфармаванасць, а значыць, і павышаная адказнасць».

— Мы доўгі час ставіліся да нашых калег з блогасферы некалькі пагардліва, лічачы, што яны не зусім прытрымліваюцца этычнага аспекту прафесіі. Так, магчыма, у іх няма журналісцкай адукацыі або вопыту, але ўплыў на грамадскасць прыкладна зраўняўся, а значыць, мы павінны лічыцца з новымі медыя, прымаць да ўвагі іх пункт гледжання, пазіцыю, новую эмацыянальнасць, якую яны нясуць на вялікую аўдыторыю, — адзначыў **старшыня Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ.** — Таму сёння вельмі важнае ўкараненне прававых стандартаў для журналістаў, прававая заканадаўчая база для нашай прафесійнай дзейнасці.

**Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** выказаў меркаванне, што новая этыка, пра якую ідзе гаворка, — гэта захаванне і перадача старых добрых маральных традыцый, якія заўсёды суіснавалі з намі, тымі, хто працуе з мастацкім і мастацка-публіцыстычным словам, праз якое выказвалі сваю пазіцыю журналісты ў розныя часы.

— Мы вельмі мала гаворым пра культуру зносін, пра тое, што гэта фундамент для вырашэння самых розных задач: грамадска-палітычных, сацыяльных, духоўных, тых, якія звязаны з патрыятычным выхаваннем грамадства ў цэлым, і моладзі ў тым ліку. Таму новая этыка — гэта ўвага да таго вопыту, які быў назапашаны за многія дзесяцігоддзі, а можа, і нашмат даўней нашымі папярэднікамі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Ведай нашых!

# НА СТАРОНКАХ — ЖЫЦЦЁ КРАІНЫ

**Выданні і журналісты Выдавецкага дома «Звязда» — сярод пераможцаў і лаўрэатаў конкурсаў «Залатая літара» і «Залатое пяро».**

Традыцыйна ў Дзень друку прайшла цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і лаўрэатаў XVII Нацыянальнага конкурсу «Залатая літара», заснавальнікам якога з'яўляецца Міністэрства інфармацыі. Сёлета на конкурс прадстаўлена 335 заявак перыядычных выданняў, інфармацыйных агенцтваў і персаналій у 25 намінацыях. Большасць заявак — 270 — з рэгіянальных СМІ, з рэспубліканскіх — 48, з карпаратыўных і гарадскіх — 17. Сярод пераможцаў конкурсу — і выданні РВУ «Выдавецкі дом «Звязда».

У намінацыі **«Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі» пераможцам стаў грамадска-палітычны, навукова-папулярны экалагічны часопіс «Родная прырода».** На працягу многіх гадоў выданне асвятляе пытанні ахоўы прыроды, захавання біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці, рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, змянення клімату з удзелам навукоўцаў і спецыялістаў-эколагаў і прадстаўнікоў грамадскасці.

Дыплом лаўрэата ў намінацыі Гран-пры **«Найлепшы творчы праект года рэспубліканскіх друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў, сеткавых выданняў» атрымаў праект «Дарогамі славы»,** рэалізаваны на старонках газеты «Звязда» да 75-годдзя Вялікай Перамогі.

У намінацыі **«Найлепшыя матэрыялы грамадска-палітычнай тэматыкі» лаўрэатам стаў праект газеты «Звязда» «Жыві і квітней, Беларусь!»,** а сярод лаўрэатаў у намінацыі **«Найлепшыя матэрыялы гісторыка-краязнаўчай тэматыкі» — праект «Ігуменскі тракт».**




Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

**Матэрыялы дадатку газеты «Звязда» «Чырвонка. Чырвоная змена» былі адзначаны ў якасці лаўрэата ў намінацыі «Найлепшыя матэрыялы маладзёжнай, дзіцяча-юнацкай тэматыкі».** Статус лаўрэата ў намінацыі **«Найлепшыя матэрыялы па тэматыцы спорту і здаровага ладу жыцця» атрымаў праект «Звязды» «Алімпіец».**

Учора таксама былі падведзены вынікі **творчага конкурсу Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро».** Пераможцам у намінацыі **«Найлепшая работа ў галіне фотажурналістыкі, дызайну» стаў загадчык аддзела фотаілюстрацый Выдавецкага дома «Звязда» Анатоль Кляшчук** *(на фота)* з праектам «Вытокі малой радзімы»

Таксама да прафесійнага свята шэраг супрацоўнікаў Выдавецкага дома «Звязда» атрымалі ганаровыя граматы і падзякі ад Міністэрства інфармацыі.

На варце

# ГОНАР І АБАВЯЗАК



**Падчас гарнізоннага інструктажу, які адбыўся ў Першамайскім РУУС сталіцы, узнагародзілі супрацоўнікаў мінскай міліцыі.**

Як падкрэсліла **старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** сімвалічна, што ў гэтыя светлыя, святочныя дні, напярэдадні Вялікай Перамогі, мы ўшаноўваем найлепшых супрацоўнікаў. «Вы — тыя, хто цаной свайго жыцця зрабіў усё, каб адстаяць мір і спакой на нашай зямлі, вы людзі гонару і абавязку, — звярнулася да людзей у пагонах спікер верхняй палаты парламента. — Народ любіць вас і паважае. Няхай служба заўсёды будзе на карысць нашай радзімы, суверэнітэту Беларусі і яе народа».

Высокія ўзнагароды, падзякі, а таксама першыя і чарговыя спецыяльныя званні — такая ацэнка добрасумленнай службы многіх праваахоўнікаў. Некаторым падраздзяленням сталічнай міліцыі ўручылі ключы ад новых службовых транспартных сродкаў — дзевяці мікрааўтобусаў і пяці аўтобусаў. У межах гарнізоннага інструктажу адбыліся паказальныя выступленні па адпрацоўцы ўводных задач.



Як адзначыў **міністр унутраных спраў Беларусі Іван КУБРАКОЎ,** агульнагарнізонны інструктаж прысвечаны ў тым ліку і Дню Перамогі. «Звычайна такія мерапрыемствы праводзяцца штоквартальна, часам штомесячна, — удакладніў міністр. — Аднак прафесійнай падрыхтоўцы супрацоўнікаў увага ўдзяляецца ва ўсіх органах унутраных спраў



штодзённа. Такія міні-інструктажы праводзяцца кожны дзень: аддаецца загад перад заступленнем на службу, работнікам ставяцца задачы, безумоўна, адпрацоўваюцца і практычныя навыкі».

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# «ВОСЬ АТРЫМАЕМ ПЕРАМОГУ, І Я ВЯРНУСЯ ДАМОЎ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Якая была для таты вайна — мы, тры яго дачкі, так і не даведаліся. Хоць наша вёска на самым беларуска-літоўскім памежжы была, што называецца, сапраўдным партызанскім краем. Многія ваявалі альбо на фронце, альбо ў партызанскіх атрадах. Але ўспамінаць пра вайну мала хто хацеў. У тым ліку і бацька. Яго не стала, калі мы з сястрой былі падлеткамі. Здавалася, яго ваеннае мінулае таксама адышло ў нябыт. Калі б не гэтыя пісьмы...



Яны адшукаліся зусім выпадкова. Літаральна летась сваякі разбіралі стары бабулін куфар, што стаяў многа гадоў у гумне. Дарэчы, я таксама яго добра памятаю — масіўны, з цяжкай накрыўкай. Пры жыцці бабулі ён стаяў на бачным месцы і быў замест шафы. Затым яго вынеслі ў гумно. Сярод розных рэчаў там ляжалі і гэтыя пісьмы. І трохвугольныя з паметкай цэнзуры «праверана», і проста пажоўклыя ад часу лісты без канвертаў, і паштоўкі. Калі сваякі прачыталі, што лісьмы ад нашага бацькі, адразу прынеслі іх нам. Ці варта казаць, як мы, сёстры, былі ўзрушаны!

Цяпер я зноў бяру іх у рукі і перачытваю. Большасць датуецца 1944—1945 гадамі. Гэта той перыяд, калі бацька быў у радах Чырвонай Арміі. Першая паштоўка адпраўлена з Баранавіч. Куды адсюль накіравалі 18-гадовага прызыўніка — невядома. У пісьмах аб гэтым не згадваецца. Толькі аднойчы прамільгнуў такі радок: «З Гродна я выехаў ужо даўно, яшчэ ў пачатку лютага, і цяпер знаходжуся на нямецкай тэрыторыі...» Яшчэ некалькі радкоў пра тое, па якім адрасе ў Гродне пакінуў сваё цывільнае адзенне.

Затое ў кожным пісьме — вельмі шмат пачуццяў. Як правіла, лісты пачынаюцца са слоў: «Прывітанне, дарагія матулечка, сястрычкі Марусенька і Любачка! Адразу паведамляю вам, што я жывы і здаровы... а сёння ў мяне вельмі шчаслівы дзень, бо я атрымаў адразу чатыры пісьмы і выслаў на іх адказы...»

Да нас праз 70 гадоў дайшло звыш дзясятка франтавых пісьмаў, у тым ліку «трохвугольнікаў». Ад некаторых лістоў засталася толькі частка. Нярэдка ў пісьмах тата распытвае маці пра сваіх братоў — Івана і Васіля, якія таксама ваявалі на фронце. Ад яе ён даведаўся пра гібель брата Васі ў 1944-м. І хоць у ягоным пісьме адчуваецца смутак, ён стараецца падтрымаць сваіх родных: «Трэба быць цвёрдымі, бо ідзе вайна, і Вам, матуля, яшчэ ёсць пра каго клапаціцца. Хутка вайна скончыцца, і вернуцца тыя, хто выжыў...»

Сям'і майго таты не пашанцавала. У вайну памёр яго бацька, сястру забілі немцы, абодвы браты загінулі на фронце. Тата, здаецца, быў упэўнены, што з ім нічога не здарыцца. У адным з пісьмаў, якое ён даслаў у лютым 1945 года, піша: «У мяне з галавы не ідуць думкі пра сваю сям'ю, пра Радзіму. Вось атрымаем перамогу, і я вярнуся дамоў...» Так і здарылася. Бацька вярнуўся без адзінага ранення і з высокімі ўзнагародамі — ордэнам і медалём.

На жаль, яны не захаваліся — неяк зніклі, невядома куды. Але добра запомніўся ордэн. У пасведчанні да яго значылася, што гэта ордэн Чырвонай Зоркі. А некалькі гадоў таму ўдалося знайсці больш падрабязную інфармацыю. З'явілася магчымасць увайсці ў электронны банк дакументаў, дзе можна даведацца пра кожнага франтавіка.

І вось што выдаў электронны пошукавік расійскага сайта podvignaroda.ru: «Радавы Ушкевіч Сяргей Сямёнавіч, разведчык разведгрупы разведаддзела штаба 2-га Беларускага фронту ў складзе групы скінуты з парашутам у тыл праціўніка на выкананне спецыяльнага задання. У складаных умовах работы на тэрыторыі Германіі з гонарам выканаў ускладзеныя на яго задачы, смела і рашуча пранікаў на аб'екты праціўніка і здабываў каштоўныя звесткі аб войсках праціўніка і яго абарончых збудаваннях».

Дык вось за што тата атрымаў свой ордэн Чырвонай Зоркі... І было яму тады роўна 20 гадоў.

## Гісторыя другая

Літаральна днямі мне ўдалося знайсці новыя факты з ваеннай біяграфіі таты. Аказваецца, яго ваенны шлях пачаўся значна раней. Яшчэ з 1943 года тата быў сувязным у партызанскім атрадзе, які дзейнічаў у лясах пад вёскай Берsuccessful Берішты. Аб ім і яго сябрах нядаўна прачытала ў зборніку «Партызанскі край» (пра зборнік — асобная гісторыя). І, што яшчэ больш здзівіла, тут быў змешчаны расказ аб маёй, тады яшчэ ў падлеткавым узросце, маме. Гэта стала сапраўднай сенсацыяй для нашай сям'і.

Зборнік, які цяпер знаходзіцца ў сямейным архіве гродзені, складалі вучні Берштаўскай сярэдняй школы пад кіраўніцтвам свайго настаўніка, Івана Лемешава, вядомага філолага, доктара навук, які пасля доўгі час працаваў у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце. А тады, у канцы 1960-х гадоў, разам са старшакласнікамі ладзіліся экспедыцыі па навакольных вёсках былога партызанскага краю. Школьнікі запісвалі ўспаміны мясцовых жыхароў пра барацьбу падчас акупацыі, партызанскія атрады, гераічныя ўчынкі.

Імя майго бацькі Ушкевіча Сяргея і яго сябра Іосіфа згадваецца ў сувязі з дзяўчынай-шпіёнкай. Вось як гэта было. Хлопцы сустрэлі яе ў лесе і запыталі, куды яна ідзе. Тая адказала, што ў Ліду, да маці. Яны тады, нібыта ў жарт, запрасілі яе да іх у партызанскі атрад. Дзяўчына нечакана згадзілася і нават прапанавала цыгарэты. На ўсякі выпадак юнакі адвялі дзяўчыну да мясцовай жыхаркі і папрасілі пачакаць. Вось толькі тая не стала марудзіць і збегла. А тут пра яе стаў пытацца нямецкі афіцэр. Жанчына расказала аб гэтым партызанам. Станавілася небяспечна, і хлопцы-сувязныя пайшлі тую дзяўчыну шукаць. У хуткім часе знайшлі і прывялі ў партызанскі лагер. Пры ператрусе знайшлі зашыты ў адзенне нямецкі пропуск. Тады яна прызналася, што падаслана гітлераўцамі. Як склаўся яе лёс, невядома.

А мяне чакаў яшчэ адзін сюрпрыз. У адным з расказаў, запісаных вучаніцай школы, убачыла знаёмыя імёны — Кузьміч Афанасій Рыгоравіч і яго дачка Соня. Дык гэта ж мае дзед і маці! Аказалася, маці, тады яшчэ падлетак, знайшла ў лесе параненага байца. Праз колькі хвілін яна ўжо вяла свайго бацьку ў той гушчар. Ён, дарэчы, прыхапіў з сабой сані, куды перанёс параненага. Той сказаў, што ён з атрада Капусты (а гэта быў вядомы камандзір партызанскага злучэння. — **Аўт.**), у апошнім баі нарваліся на нямецкі заслон, разрыўная куля трапіла ў бядро.

Параненага ўнеслі ў дом, пераапранулі і паклалі на ложак за печкай. Партызан расказаў, што яго завуць Іван Чарняўскі, родам ён з-пад Мінска. Зінаіда Андрэеўна (мая бабуля) паіла яго травянымі настоямі і прамывала рану. Але тут патрэбны былі іншыя медыцынскія прэпараты, якіх не было. Пакуты, якія цярпеў малады баец, закраналі і яго даглядчыкаў. А ў вёсцы ўсё часцей сталі з'яўляцца гітлераўцы. Тады дзед прыняў рашэнне знайсці партызанаў і расказаць ім пра Івана. Ён сустрэў двух разведчыкаў, і тыя прапанавалі прывезці параненага ў зямлянку, абяцалі прыслаць фельчара. Сапраўды, на назе пацярпелага хутка з'явіўся новы бінт, а побач — пустыя ампулы. Два тыдні сям'я дзеда змагалася за жыццё юнака ў акупаванай вёсцы. На жаль, выратаваць яго без кваліфікаванай медыцынскай дапамогі не ўдалося... Здаецца, маці ўспамінала пра гэтага байца, шкадавала яго. Магчыма, праз гады яна зразумела, за што аддаў сваё жыццё гэты хлопец. За будучае яе дзяцей...



## У «Звязду» — з франтавога блакнота

Аказалася, што ваенныя дзеянні партызанскага краю знайшлі адлюстраванне і на старонках газеты «Звязда». Тут у № 41 за 4 жніўня 1944 года надрукаваны артыкул «У Берштах» ваеннага карэспандэнта Якуба Качана, які знаходзіўся ў складзе войскаў 3-га Беларускага фронту.

Вось як ён апісваў сітуацыю падчас акупацыі: «Партызаны трывала заселі ў навакольных лясах. Гэта быў другі для іх родны дом. Тут яны знаходзілі сабе прытулак. ...Немцы баяліся сунуцца да лясных гушчароў, суседства лясных жыхароў косткай сядзела ў іх у горле... Партызаны рабілі сваю справу — пад адхон ляцелі паязды, у гарнізонах гарэлі склады, у засадах гінулі акупанты».

Савецкія войскі ішлі ў наступленне, — піша аўтар. І вельмі важна было ачысціць гэты населены пункт ад ворага, бо вёска знаходзілася на важнай магістралі, якая вяла на Гродна. Быў распрацаваны спецыяльны план аперацыі. Начальнік штаба партызанскага руху Беластоцкай вобласці генерал Філіп Капуста загадаў камандзіру аднаго з партызанскіх атрадаў узяць Бершты і трымаць да падыходу савецкіх войскаў. Але аказалася, што немцы ўжо пакінулі вёску, таму шлях быў адкрыты для наступлення. Перадавыя часці ўступілі ў Бершты, а затым рушылі далей на захад.

Вось якой аўтар убачыў тады вёску: «Там, дзе да вайны была школа, немцы размясцілі сваё ўпраўленне, двор абнеслі драўлянай сцяной з адтулінамі для амбразур, на ўскрайку была вышка, з якой немцы назіралі за вёскай і падступамі да яе. Бальніцу пераўтварылі ў жандармерыю. Там, дзе раней лячылі людзей, немцы білі і катавалі мірных жыхароў...»

Калі я сёння думаю пра гэта, становіцца жахліва. Страшна нават уявіць, як людзі ішлі праз вайну з такім грузам вялікіх страт...

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Фота аўтара.**

*Пісьмы, фрагменты з кнігі «Партызанскі край» і з архіва сям'і.*

Сямейная газета

Выпуск № 8 (167)

# Крызіс трох гадоў. Да чаго рыхтавацца?

**Пра крызіс трох гадоў не раз чулі не толькі бацькі, якія выхоўваюць дзяцей, а і іх сваякі, сябры, нават суседзі (асабліва калі ў малога істэрыка, а дом панэльны). Мы, прызнацца, чакалі гэтага перыяду з трывогай, бо акурат адбыўся наш пераезд з вёскі ў сталіцу і Цёмік упершыню пайшоў у дзіцячы садок.**

Навукоўцы пішуць, што крызіс трох гадоў характарызуецца кардынальнымі зменамі ў паводзінах дзіці, з'яўленнем у яго новых якасцяў, інтарэсаў, яно па-іншаму глядзіць на тых, хто з ім кантактуе, — адным словам, дзіця становіцца больш дарослым, а значыць, навакольнае асяроддзе яму ўжо падаецца інакшым. Паспрабую коратка абазначыць галоўнае.

НЕПРАДКАЗАЛЬНАСЦЬ. У першы дзень, калі Цёмік пайшоў у дзіцячы садок, мы былі на сёмым небе ад шчасця. Ён с лёгкасцю сказаў нам «да сустрэчы» і пайшоў гуляць з дзеткамі. Калі ж праз дзве гадзіны прыйшлі малога забіраць, выхавальніца паведаміла такія чаканыя для бацькоў словы: Арцём вельмі актыўны хлопчык, ён не плакаў і, акрамя таго, што даў аднаму хлопчыку кухталя, у цэлым быў паслухмяны. На наступны дзень сітуацыя кардынальна змянілася: ужо з парога малы заенчыў, што ў садок ён больш не пойдзе. Таму некалькі дзён запар мы вымушаны былі хуценька пераапранаць Арцёма, які галасіў на ўсю ўстанову, і ледзь не сілай запіхваць яго ў групу.

ІСТЭРЫКА. Нават калі няма на тое падстаў, дзіця кідаецца ў істэрыку. Без прычыны. Проста таму што я, а не ён, націснула на кнопку і выклікала ліфт. Таму што я несвоечасова, як ён, напэўна, думае, выключыла тэлевізар. Таму што ён сам хацеў расшпіліць сваю куртку, а я яго апярэдзіла. Таму што я прапанавала яму да гарбаты пячэнне, а ён хацеў абаранкі...

САМАСТОЙНАСЦЬ. Ва ўзросце трох гадоў дзіця ўжо многае ўмее і робіць само. Праўда, не заўсёды гэта атрымліваецца добра. Таму можна зразумець, чаму малое нервуецца, калі мама яго пераапранае: яно ж само справілася, а маме не падабаецца, што штаны надзеты задам наперад! Напрыклад, Цёмік любіць сам чысціць зубкі, хоць і не зусім дасканала, выбіраць у краме прадукты (ужо дома я заўважаю, што сярод накладзеных ім у мяшэчак мандарынаў некалькі гнілых), сам спрабуе ўключаць пыласос і прыбіраць дома (калі гэта, канешне, можна лічыць прыбіраннем). Па меркаванні вядомага амерыканскага псіхолага Э. Эрыксана, у такім узросце пачынае фарміравацца воля і звязаныя з ёй якасці — незалежнасць і самастойнасць. Вядома, многім бацькам прасцей і хутчэй самім накарміць дзіця, апрануць яго, памыць. Аднак не варта: малое ўжо добра ўсвядоміла, што ўсё гэта можа і ўмее рабіць яно само. Не перашкаджайце, паверце ў яго магчымасці!

ПРАТЭСТ. У гэты перыяд для дзіцяці не існуе слова «нельга». І няважна, што часта Цёмік пытаецца: «Мама, можна мне?..» Ён усё роўна хоча пачуць тое, што хоча. Напрыклад, хоча ісці гуляць на вуліцу, але пратэстуе супраць таго, каб яго апранаді. Ці плануе павазіць на сваіх машынах цыбульку, але без мамы ці таты не будзе. Ён ідзе на гульнявую пляцоўку да дзяцей, але дзяліцца з імі цацкамі і месцам на арэлях не гатовы. Набірае нумар тэлефона свайго любімага дзеда і на паўслове кідае трубку: размова не атрымліваецца. Толькі і чуваць: «Не!», «Не хачу!», «Не буду!»

ПАРУШЭННЕ СНУ, АДСУТНАСЦЬ АПЕТЫТУ. Бацькі рана расслабіліся. Здавалася, бяссонныя ночы скончаны — нарэшце, можна выспацца. Але гэта не так! Дзіця зноў пачынае круціцца ў сне, прачынацца, часам размаўляе (напэўна, нешта сніцца?), бывае, што нават плача. З ядой таксама не ўсё складваецца. Тое, што Цёмік нядаўна вельмі любіў, раптам становіцца нясмачным, «бякай», як ён кажа. Часта сын адмаўляецца ад сняданку. І няважна, што гэта: каша, сырнікі ці нават торт. А бывае, што, сытна павячэраўшы, ужо ў ложку кажа, што хоча яшчэ паесці.

ПАЧЫНАЕ ХЛУСІЦЬ. Прыйшлі нядаўна да нас госці. Грае музыка, танцуем. Залятае ў пакой Цёмік і таксама пачынае танчыць. Праз дзве хвіліны хаваецца ў сваім пакоі і плача. На маё пытанне, што здарылася, адказвае, што тата не дазваляе яму танцаваць. Такога, канешне, не было: любым бацькам за мілую душу паглядзець, як скача іх малое. Альбо на днях сказаў, што ў дзіцячым садку яго напалохаў хлопчык. Як запэўніла выхавальніца, такога ў прынцыпе не магло быць.

Што ў гэты складаны як для дзяцей, так і для дарослых перыяд рабіць бацькам? Галоўнае — трымаць сябе ў руках і не нервавацца: дзеці адчуваюць наш настрой. Увесь свой вольны час прысвячаць ім, максімальна акружыць клопатам і любоўю. Цярпення ўсім нам!

**Вераніка КАНЮТА.**

---

Тыя, хто побач

**Мікалай ЧЫРСКІ:**

# «НАС САСВАТАЛА СЯМ'Я КУПАЛЫ»




**Сям'я ЧЫРСКІХ каля мемарыяльнай дошкі мамы (Мікалай Арсенцьевіч — другі злева).**

**Нагодай для сустрэчы з найстарэйшым беларускім экскурсаводам Міколам ЧЫРСКІМ паслужыла яго новая кніга «Via est vita. Дарога — гэта жыццё», у якой ён піша пра родную Случчыну і пра сваю сям'ю. Мікола Арсенцьевіч упэўнены, што падмурак шчаслівага жыцця дзяцей закладваюць бацькі — любоўю і клопатам.**

***— Раскажыце, калі ласка, пра сям'ю сваіх бацькоў.***

— Мой тата нарадзіўся на хутары, дзед быў заможным селянінам і, вядома ж, хацеў лепшай долі для сына, чым працаваць у калгасе за працадні. Таму знайшоў магчымасць адправіць яго вучыцца на чыгуначніка. Мама рана асірацела і ў 11 гадоў пайшла працаваць на ферму... Бацькі перажылі 1930-я гады, вайну.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

---

Вакол нас

# КРОКІ ДА ІНКЛЮЗІІ

## Праз спорт да роўных магчымасцяў

**Таццяна ЯКАЎЛЕВА — музыкант, педагог і дырэктар міжнароднай дабрачыннай грамадскай арганізацыі «Аўтызм. Дзеці. Бацькі». Трынаццаць гадоў таму яна стала шматдзетнай маці: у яе нарадзіўся сын Ілья, які змяніў яе жыццё назаўседы. У тры з паловай года яму паставілі дыягназ: аўтызм. Ёй здавалася, што гэта немагчыма. Малы нічым не адрозніваўся ад іншых дзяцей.**

**Калі хлопчыку было два гады, ён раптам перастаў размаўляць, але такое здараецца з некаторымі дзецьмі, таму Таццяна не ўспрымала асаблівасць сына як трагедыю. Ілья не любіў хадзіць у госці, пачынаў гучна плакаць і закрываў вушкі, але тады здавалася, што гэта такая рыса характару. Хлопчык не мог утрымаць увагу надоўга, але ён быў зусім маленькі, і здавалася, што ён проста абстрагаваўся, калі яму станавілася нецікава. Былі праблемы і са сном.**



**○ Даведка**

МДГА «Аўтызм. Дзеці. Бацькі» — адзіная арганізацыя з рэспубліканскім статусам у галіне праблем аўтызму. Яна аб'ядноўвае больш за 200 беларускіх сем'яў, мае рэгіянальных прадстаўнікоў у абласных і раённых гарадах: Брэсце, Гродне, Гомелі, Магілёве, Баранавічах, Мазыры і іншых. Працуе ў партнёрстве з дзяржаўнымі структурамі і міжнароднымі дабрачыннымі фондамі.

Ільі ішоў чацвёрты год, калі ўчастковы педыятр звярнула ўвагу маці на асаблівасці сына. У хуткім часе яны аказаліся на прыёме ў псіхіятра, які і паставіў дыягназ. Таццяна не разумела, што значыць «аўтызм», і таму на некалькі месяцаў нырнула ў інтэрнэт, каб даведацца, што гэта такое і як дапамагчы сыну.

З часам Таццяна зразумела, што спачатку ёй трэба аб'яднаць бацькоў такіх дзяцей, каб мець магчымасць падтрымліваць адзін аднаго. Так з'явілася міжнародная дабрачынная грамадская арганізацыя «Дзеці. Аўтызм. Бацькі», якая сваёй мэтай бачыць спрыянне развіццю інклюзіўнага грамадства.

— Дзеці з расстройствам аўтыстычнага спектра (РАС) патрабуюць сацыяльнага ўключэння, — тлумачыць кіраўнік грамадскай арганізацыі. — Вельмі важна, каб яны вучыліся ўзаемадзейнічаць з іншымі людзьмі. Калі гэтага не рабіць, то такія дзеці, стаўшы дарослымі, не змогуць жыць самастойна. Гэта гора не толькі для бацькоў і родных — дзяржава губляе будучых падаткаплацельшчыкаў. Калі стварыць інклюзіўнае асяроддзе для людзей з РАС, то яны змогуць жыць як звычайныя людзі і прыносіць карысць дзяржаве.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Акцыя

# Абарона дзяцей і сям'і

## Ратавальнікі нагадваюць пра бяспеку

**Распачалася рэспубліканская акцыя «Не пакідайце дзяцей адных», прысвечаная бяспецы дзяцей і прымеркаваная да Міжнароднага дня сям'і і Дня абароны дзяцей, паведамілі ў Міністэрстве надзвычайных сітуацый.**

Акцыя пройдзе з 3 мая да 1 чэрвеня і заклікана прыцягнуць увагу да праблемы дзіцячага свавольства з агнём і гібелі дзяцей на пажарах, паспрыяць зніжэнню колькасці надзвычайных сітуацый з удзелам дзяцей і гарантаванню іх агульнай бяспекі (дома, на вуліцы, падчас адпачынку і іншага). Мерапрыемствы пройдуць у чатыры этапы.

Першы этап праходзіць з 3 да 15 мая ў гандлёва-забаўляльных цэнтрах, кінатэатрах, адкрытых пляцоўках і ў іншых месцах, дзе бацькі адпачываюць разам з дзецьмі. Для ўдзельнікаў акцыі разгорнуцца паркі атракцыёнаў «МНС-Лэнд», дзе будуць арганізаваны інтэрактыўныя пляцоўкі з конкурсамі, віктарынамі і гульнямі. У рамках Міжнароднага дня сям'і ратавальнікі правядуць спартыўныя конкурсы для дзяцей і іх бацькоў «Мама, тата, мы — у бяспецы моцныя».

З 3 да 15 мая ва ўсіх раёнах Мінскай вобласці стартуе першы этап новага рэспубліканскага конкурсу «Сем'Я бяспекі». Удзельнікі конкурсу будуць з дапамогай прозы, паэзіі альбо песні раскрываць важнасць асноў бяспекі жыццядзейнасці ў сям'і і вучыцца захоўваць гэтыя правілы самім. Работы пераможцаў раённых этапаў будуць удзельнічаць у абласным этапе конкурсу і найлепшыя з іх адправяцца ў сталіцу, дзе на адкрытай пляцоўцы Палаца дзяцей і моладзі прагучыць фінальны акорд конкурсу.

Другі этап акцыі пройдзе з 17 да 21 мая. Асноўны акцэнт будзе зроблены на будучых і маладых бацьках, з якімі ратавальнікі правядуць інтэрактыўныя гутаркі «Галоўны эксперт», «Веру — не веру» і гульні «Пытанне — адказ», «Супер-мама. Супер-тата». Мерапрыемствы гэтага этапу пройдуць ва ўстановах аховы здароўя.

Таксама ратавальнікі правядуць мерапрыемствы і для маладых бацькоў падчас выпіскі з радзільных дамоў. Наваспечаных бацькоў не толькі павіншуюць з нараджэннем дзяцей, але і раскажуць пра важнасць стварэння бяспечных умоў жыцця для новага члена сям'і і падораць ім у якасці напаміну пра гэта наглядна-выяўленчую і сувенірную прадукцыю.

На трэцім этапе акцыі (24 — 28 мая) асаблівая ўвага будзе аддадзена шматдзетным сем'ям і сем'ям, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Работнікі МНС правядуць гутаркі, гульні і віктарыны па АБЖ як з дзецьмі, так і з іх бацькамі, пакажуць мультфільмы і ўручаць падарункі. А ў дзіцячых забаўляльных цэнтрах, дамах культуры і арганізацыях грамадскага харчавання адкрыюцца інтэрактыўныя навучальныя пляцоўкі.

Заключны этап акцыі адбудзецца 31 мая і 1 чэрвеня. Ён будзе прымеркаваны да Міжнароднага дня абароны дзяцей. Шырокамаштабныя мерапрыемствы пройдуць на адкрытых пляцоўках у парках адпачынку. Работнікі МНС арганізуюць інтэрактыўныя зоны, віктарыны і конкурсы, выступленні падраздзяленняў МНС, тэатралізаваныя прадстаўленні на тэму бяспекі, а таксама прадэманструюць аварыйна-выратавальную тэхніку і абсталяванне.

Конкурс

# Дзеці маюць права

**Працягваецца рэспубліканскі конкурс творчых работ «Права на дзяцінства», пра які абвясціла Міністэрства юстыцыі**

**Удзельнікамі могуць стаць хлопцы і дзяўчаты ва ўзросце да 18 гадоў. Творчае спаборніцтва праводзіцца па трох намінацыях: «Малюнак», «Анімацыя» і «Відэаролік».**

Работы могуць быць прысвечаны такім тэмам, як «Правы дзіцяці», «Сацыяльная ахова сям'і і дзяцей дзяржавай», «Ахова правоў дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў», «Правы дзяцей-інвалідаў», «Абавязкі дзіцяці».

Яшчэ адна тэма — «У адзінстве — наша сіла». У гэтых работах павінна адлюстроўвацца тэма правядзення Года народнага адзінства ў Беларусі.

У 2020 годзе ў дадзеным конкурсе ўзяло ўдзел больш за 2 тыс. дзяцей з усіх куткоў краіны, а пераможцы былі ўзнагароджаны дыпломамі і каштоўнымі прызамі.

Па выніках праведзенага ў 2020 годзе конкурсу «Права на дзяцінства» ў Міністэрстве юстыцыі з'явілася тэматычная пастаянная экспазіцыя, дзе прадстаўлены работы конкурсантаў.

Улічваючы жывую цікавасць і вялікую колькасць творчых работ, прынята рашэнне аб правядзенні рэгіянальных этапаў конкурсу, па завяршэнні якіх найлепшыя з іх паўдзельнічаюць у рэспубліканскім конкурсе і інтэрнэт-галасаванні.

Конкурсныя работы прымаюцца да 10 мая 2021 года. Малюнкі неабходна накіроўваць па пошце ў галоўны ўпраўленні юстыцыі аблвыканкамаў ці Мінскага гарвыканкама, а работы ў намінацыях «Анімацыя» і «Відэаролік» падаюцца дыстанцыйна і павінны быць размешчаны ў воблаку на серверы ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт і даступныя для запампоўвання.

Імёны пераможцаў будуць названыя ў Дзень абароны дзяцей — 1 чэрвеня 2021 года.

# КРОКІ ДА ІНКЛЮЗІІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Сёння мы ведаем шмат вядомых людзей з РАС, якія не лічацца інвалідамі, напрыклад, рэжысёр Стэнлі Кубрык, музыкант і актрыса Кортні Лав і шмат іншых.

***— Інклюзія — працэс РЭАЛЬНАГА ўключэння людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў актыўнае грамадскае жыццё. На ваш погляд, ці можна сёння наша грамадства назваць інклюзіўным?***

— Інклюзія — гэта ўключэнне ў звычайнае і звыклае для ўсіх дзяцей ці нас, дарослых, жыццё.

Каб адказаць на гэта пытанне, варта проста прааналізаваць сітуацыю аб тым, ці рэальна дзеці з асаблівасцямі здароўя ёсць усюды і побач з нашымі звычайнымі дзецьмі? Наша грамадства робіць у гэтым кірунку толькі першыя крокі. Інклюзію нельга разглядаць як асобны элемент: напрыклад, ёсць у дзіцяці або сям'і магчымасць удзелу ў тым ці іншым праекце. Трэба, каб кожнае дзіця з асаблівасцямі ў развіцці магло наведваць звычайны садок, школу, каледж або ВНУ без абмежаванняў у выбары спецыялізацыі, а пасля вучобы магло працаўладкавацца. Калі хоць бы адзін элемент з пералічаных выпадае, то і сацыялізацыя, і рэалізацыя правоў такога дзіцяці або дарослага не поўная, а значыць, гэта не ёсць інклюзія.

**«У нас склалася культура, дзе больш зразумелым лічыцца «пашкадаваць» і пакінуць дзіця з асаблівасцямі ў развіцці дома, каб не даць яму лішняй нагрузкі».**

Іклюзіўнае грамадства — гэта калі на ўсіх узроўнях ёсць прапановы, веды і дасканаласць практыкі. Мы пакуль толькі кажам, хочам і думаем, як гэта зрабіць. Я яшчэ б дадала, што мы павінны ўмець сёння гаварыць пра гэта натуральна і адкрыта. Нельга саромецца абмяркоўваць праблему. Чым раней мы зразумеем, што ёсць дыскрымінацыя ў адносінах да людзей з абмежаванымі магчымасцямі, тым хутчэй мы знойдзем выйсці і рашэнні.

***— У чым выяўляецца дыскрымінацыя?***

— У краіне ёсць інтэграцыя і «спецыяльныя» ўмовы, інклюзіі пакуль няма. Напрыклад, для рэалізацыі інклюзіўнай адукацыі трэба, каб педагогі валодалі метадамі інклюзіўнай практыкі. Інклюзія ў адукацыі — гэта перш за ўсё пераход на агульную праграму і навучанне побач з аднагодкамі. Роля інклюзіі не толькі ў ведах, але і ў магчымасці штодзённага ўдзелу ў мерапрыемствах, у магчымасці камунікацыі. Камунікатыўныя навыкі, напрыклад, для дзяцей з аўтызмам — гэта практычна першая задача для педагога, аснова ўсіх асноў. А гэтаму трэба вучыцца, той жа альтэрнатыўнай камунікацыі, калі «невербальныя дзеці» могуць мець зносіны і з іншымі дзецьмі, настаўнікамі, і іх разумеюць. І вучыцца такому дзіцяці важна не ў іншым раёне, дзе ёсць інтэграцыйны клас, а ў сваім, дзе шмат суседзяў-сяброў, з якімі малы будзе разам хадзіць у школу і назад. Сяброўства паміж дзецьмі і ёсць аснова будучага інклюзіўнага грамадства. На самай справе прыкладаў інклюзіі можна ў свеце знайсці шмат. Хацелася б укараняць іх у жыццё і ў нашай краіне.


Фота Яна ХВЕДЧЫНА.
Таццяна ЯКАЎЛЕВА з мужам і дзецьмі.

Што датычыцца дыскрымінацыі ў нашым выпадку, то гэта сацыяльныя абмежаванні па прыкмеце інваліднасці, якіх быць не павінна. Надомнае навучанне дзяцей-інвалідаў або ў інтэграцыі па спецыяльнай праграме без наведвання агульнага класа, або частковае наведванне і ёсць дыскрымінацыя. Спецыяльныя школы без магчымасцяў вучыцца навыкам камунікацыі ў звычайных умовах — таксама абмежаванне. Адсутнасць педагагічнай практыкі, вопыту і ведаў у педагогаў — таксама дыскрымінацыя.

Гэты спіс можна падоўжыць. Ці шмат інвалідаў у нас на вуліцах? Ці ёсць для іх абавязковыя сэрвісы? Камусьці трэба каляска з поўнай тэхнічнай падтрымкай, каб мець магчымасць быць побач з людзьмі, камусьці — гаджэт з праграмай набору тэксту і перакладу ў словы, каб выказаць сваё пажаданне. Ці даступныя гэтыя тэхнічныя магчымасці? Ці лёгка знайсці людзям з абмежаванымі магчымасцямі работу? Адказваючы на гэтыя пытанні, разумееш, што наша грамадства рухаецца да інклюзіі вельмі няспешна.

***— І ў чым, на ваш погляд, прычына?***

— Калі разглядаць сітуацыю з псіхалагічнага пункту гледжання, думаю, справа ў стэрэатыпе паводзінаў. Для людзей інклюзіўная мадэль грамадства пакуль нязвыклая. У нас склалася культура, дзе больш зразумелым лічыцца «пашкадаваць» і пакінуць дзіця з асаблівасцямі ў развіцці дома, каб не даць яму лішняй нагрузкі. У школах у дзяцей з інваліднасцю свая праграма, свае «кнігі», не такія, як у іншых дзяцей. Гэта вельмі перашкаджае аб'ядноўвацца на старце.

***— А што можа зрабіць у гэтым кірунку звычайны абывацель: кіроўца, прадавец, менеджар?***

— Навучыцца рэагаваць на дзяцей спакойна, даць ім права на капрызы і асаблівыя паводзіны. Тут формула сацыяльнага шчасця адна на ўсіх. Мы ўсе розныя, і трэба нам разам неяк ужывацца. Зразумець і прыняць для сябе тое, што бацькам асаблівых дзяцей вельмі складана з людзьмі, якія не разумеюць, як можна ім дапамагчы. А дапамога патрэбна проста ўсмешкай, эмпатыяй. Здолець проста не павысіць голас і не абурыцца, калі здаецца, што дзіця гучна крычыць. Я са сваім сынам пабывала ў многіх краінах свету, і першае, што кідаецца ў вочы ў інклюзіўных грамадствах, — адчуванне камфорту, пазітыўнасць і натуральнасць знаходжання побач розных людзей.

Магчыма, нашым людзям патрэбна больш часу для прыняцця дзяцей з асаблівасцямі ў развіцці, але я веру, што з часам і прадавец, і ахоўнік у гадлёвым цэнтры ці проста спадарожнікі ў метро навучацца гэтаму. Важна пачаць. Нешта падобнае на інклюзію можна сёння ўбачыць у нашым праекце «Спорт-інклюзія», накіраваным на інтэграцыю дзяцей з аўтызмам у калектыве іх аднагодкаў. Праект запушчаны некалькі гадоў таму, і вельмі ўдалы. Нас падтрымала Міністэрства спорту і турызму, і таму сёння мы ўжо ідзём у рэгіёны.

**«Іклюзіўнае грамадства — гэта калі на ўсіх узроўнях ёсць прапановы, веды і дасканаласць практыкі. Мы пакуль толькі кажам, хочам і думаем, як гэта зрабіць».**

***— Чаму вы лічыце, што праект удалы?***

— Спорт я разглядаю як адзін з інструментаў інклюзіі, бо гэта тое, што аб'ядноўвае і дзяцей, і дарослых. Гэта мова эмоцый і праява сябе, гэта каманда і адчуванне чалавека часткай цэлага, гэта сябры і асаблівы спосаб быць паспяховым.

Вядома, як і для любога іншага дзіцяці, спорт для дзяцей з аўтызмам — гэта перш за ўсё ўласны выбар «свайго» віду спорту, але мы пачалі першыя крокі з плавання.

Вада мае рэабілітацыйныя ўласцівасці. Яна кампенсуе стан сэнсарнай нестабільнасці, а для дзяцей з аўтызмам гэта вельмі важна. Мы стварылі інклюзіўныя групы плавання, якія на 10—15 % складаюцца з дзяцей з РАС. Малыя з аўтызмам на занятках даволі хутка ўключаюцца ў работу і камунікацыю з іншымі дзецьмі. У групах працуюць псіхолаг і два трэнеры, а гэта гарант паспяховасці не толькі для дзіцяці з аўтызмам — гэта дапамога ўсім дзецям у іх фізічнай і псіхалагічнай рэалізацыі. Вельмі частая з'ява для звычайнага дзіцяці — баяцца вады, не ўключацца ў інструкцыі трэнера: усім цяжка ўтрымліваць увагу на працягу ўрока. Новыя педагагічныя метады, усе дасягненні сучаснай педагогікі дазваляюць дапамагаць усім дзецям у групе, а не толькі малым з аўтызмам. Мы хочам, каб такія гурткі з'яўляліся не толькі ў Мінску. Таму як мінімум адзін-два рэгіёны ў нас з верасня ў планах на запуск заняткаў. Упэўнена, што спорт валодае неверагоднай сілай аб'ядноўваць усіх разам, незалежна ад фізічных або інтэлектуальных здольнасцяў. Мы ганарымся гэтым праектам, і я думаю, што дзякуючы яму мы здолеем даказаць, што інклюзіўнае грамадства ў краіне магчыма.

Матэрыялы падрыхтавала Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

# «НАС САСВАТАЛА СЯМ'Я КУПАЛЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Захоўваючы памяць пра мінулае, заўсёды глядзелі ў будучыню. Мама нарадзіла шасцярых дзяцей, пры гэтым працавала ў калгасе паляводам і ў школе прыбіральшчыцай. Тата, калі ўжо цяжка было працаваць абходчыкам, уладкаваўся на чыгуначны пераезд. Бацькі заўсёды шмат працавалі. А яшчэ дадайце да гэтага вялікую моцную ўласную гаспадарку. Пры тым мае бацькі — вельмі адукаваныя людзі. Гэта не пра дыпломы, а пра тое, што ў доме было шмат кніг, выпісвалі самую цікавую перыёдыку. Тата іграў на многіх інструментах, меў прыгожы голас. Вось у такой атмасферы я рос. Была яшчэ традыцыя — літаральна з трох гадоў бацькі абавязкова бралі нас з сабой, калі ішлі на магілкі праведваць продкаў. І, ведаеце, мне здаецца, што гэта вельмі моцны якар, які прывязвае да роднай зямлі.

**«Распісаліся, і адразу панёсся даганяць свой цеплаход. Начальства вылічыла, у якім горадзе мне трэба сысці з яго і ў якім вярнуцца».**

***— Тым не менш вы самі і вашы браты-сёстры з'ехалі з роднай вёскі. Чаму?***

— Можна, я спачатку адкажу на пытанне: «Як?» Думаю, такі экскурс у гісторыю можа быць цікавы маладым людзям. У часы маёй маладосці жыхару вёскі было вельмі цяжка, амаль немагчыма атрымаць пашпарт. Такое вось прыгоннае права па-савецку. Ледзь не адзінай магчымасцю быў выезд у горад па аргнабору на будоўлю, чым мы і скарысталіся. У Мінск я прыехаў пасля 8 класаў, пайшоў працаваць на будоўлю і вучыцца ў вячэрнюю школу рабочай моладзі. А з'ехалі мы, таму што дзякуючы бацькам і свету, які перад намі адкрывалі кнігі, нам хацелася большага, чым магло быць дома. У часы маёй маладосці выбар работы ў вёсцы быў мінімальны. І, дарэчы, жыццё без пашпарта нам здавалася зневажальным, няправільным, мы не разумелі, у чым правініліся сяляне, што іх так абмежавалі ў праве выбару месца жыхарства і прафесіі. У Мінску я атрымаў пашпарт і месца ў інтэрнаце. Але быў і такі момант: я размаўляў толькі па-беларуску, і ў тралейбусе мяне абазвалі калгаснікам. Гэта стала стымулам вывучыць рускую мову, ды так, што, калі вазіў турыстаў у Расію, там адзначалі маю правільную гаворку.



***— А як будаўнікі становяцца экскурсаводамі?***

— Мне ўсё было цікава! Таму ў сакавіку 1971 года я апынуўся ў Мінскім бюро падарожжаў і экскурсій. Прынялі мяне на работу пазаштатна, а пасада называлася «групавод». Што я рабіў? Напрыклад, мая першая група — жыхары Мінскай вобласці, якіх трэба было сустрэць на вакзале і адвезці ў цырк. Потым заданні былі паскладаней. А неўзабаве мяне пачалі адпраўляць у Ленінград. Мы выязджалі аўтобусам ЛАЗ у пятніцу, да апоўначы прыязджалі ў горад на Няве. У самым пачатку 1970-х не браніравалі гасцініцы і не заказвалі харчаванне. Усе суправаджальныя тургруп шукалі, дзе размясціць людзей. Я дамаўляўся з камендантамі рабочых і студэнцкіх інтэрнатаў. Таксама і з харчаваннем знаходзіў варыянты. Суправаджальны — гэта той, хто арганізоўвае побыт турыстаў, а экскурсіі праводзіць іншы спецыяліст. Ужо ў сярэдзіне 1970-х перайшлі працаваць на цывілізаваныя рэйкі, калі ўсё заказваецца.

***— У вашым жыцці быў яшчэ адзін зігзаг, калі вы прыйшлі працаваць у музей Янкі Купалы.***

— Да таго часу я ўжо паступіў на філфак педінстытута імя Горкага, цяпер гэта педуніверсітэт імя Максіма Танка. Даводзілася праводзіць экскурсіі ў парку Янкі Купалы, а тады для турыстаў музей песняра быў абавязковай праграмай. Да нас прыязджалі турыстычныя цягнікі з 12 вагонаў! Музейшчыкі да мяне прыгледзеліся і запрасілі на работу навуковым супрацоўнікам. І я пайшоў з будоўлі, дзе быў добры заробак, на 70 рублёў у месяц у музеі. Месца пазаштатнага экскурсавода таксама захаваў. І, ведаеце, у інтэрнаце будтрэста № 4 на Якуба Коласа, 42 мяне таксама пакінулі, нават пасялілі ў лепшы пакой. Жылося вельмі нядрэнна, таму што бацькі заўсёды давалі хатнія гасцінцы — сала, тварог, гародніну. Яшчэ мама заўсёды давала на дарогу 10 рублёў. Мне было нязручна браць у мамы грошы, але я хутка зразумеў, што для яе вельмі важна дапамагаць сваім дзецям.



Сям'я ЧЫРСКІХ, 1950-я. Мікола — другі злева.

***— Як мне распавялі агульныя знаёмыя, ажаніліся вы позна па ранейшых мерках, у 33 гады. Не ціснулі калегі і сваякі: «Калі сям'ю створыш?»***

— Калегі на мяне маліліся! Скажыце мне, якая замужняя жанчына з дзецьмі паедзе на выхадныя з турыстамі? Некалькі гадоў, а калі быць дакладным, то з 1977-га да 1991-га, я працаваў дырэктарам круізных цеплаходаў з красавіка да лістапада — гэта значыць, увесь сезон навігацыі на Волзе (былі такія маршруты для турыстаў з БССР). А родныя, вядома, перажывалі, але не ціснулі, усё было вельмі далікатна.

**«Я ж бачыў, як мая мама купала малодшага брата: у драўляныя ночвы сцяліла льняное палатно і на яго клала дзіця. Таму я настаяў, каб і для ўнука ў ваннанчцы ляжала нешта мяккае».**



Мікалай ЧЫРСКІ ў музеі валуноў.

***— Як пазнаёміліся з будучай жонкай?***

— Пасля звальнення з музея Янкі Купалы па магчымасці заходзіў да калег. І аднойчы пазнаёміўся там з маладой дзяўчынай. Мы бачыліся на розных мерапрыемствах, потым дзяліліся ўражаннямі, пачаў праводзіць яе дадому. Ларыса цікавілася, як паступіць на курсы экскурсаводаў. Мы столькі гутарылі пра Янку Купалу і Уладзіславу Францаўну, што можна смела казаць: нас сасватала сям'я Купалы. І прапанова стварыць сям'ю неяк сама сабой атрымалася.

***— Гэта значыць, ніякіх доўгіх заляцанняў?***

— Адзіны, калі так можна сказаць, варыянт заляцанняў — запрашаў Ларысу ў рэстаран «Сёмае неба», што ў гасцініцы «Мінск». Зарабляў я добра, сувязі меў, таму трапіць у рэстаран было не праблематычна. Зноў жа патлумачым маладым чытачам, што ў савецкі час паход у рэстаран — той яшчэ квэст: мала было мець грошы — трэба было ўмець зайсці ў яго. У нас наогул усё было нетыпова. Ледзь выпрасіў адпачынак на тры дні, каб сходзіць у ЗАГС. Распісаліся, і адразу панёсся даганяць свой цеплаход. Начальства вылічыла, у якім горадзе мне трэба сысці з яго і ў якім вярнуцца.

***— А знаёмства з бацькамі як прайшло?***

— Добра. Ларыса нарадзілася ў Мінску, а яе бацькі такія ж прыезджыя, як я. Можа, таму вельмі цёпла сустрэлі, прапанавалі жыць у іх, і на першы час мы гэтую прапанову прынялі. Зноў жа ў той час знайсці здымную прыватную кватэру было няпроста. Да маіх бацькоў прыехалі ўжо пасля роспісу і заканчэння навігацыі на Волзе. Мы з Ларысай катэгарычна не хацелі ніякага вяселля. Але блізкія сваякі ўсё ж вечарам сабраліся нас павіншаваць. Яшчэ наракалі, што не папярэдзілі: ні ў кога не было падарункаў. Я сказаў, што можна аддаць грашыма *(смяецца)*. Так яны і зрабілі.

***— Жонка маладзейшая за вас на дзесяць гадоў. Як гэтая розніца ўспрымаецца ў розныя перыяды жыцця?***

— Спачатку мне зайздросцілі: маладая жонка, спачатку 33 і 23 — даволі прыкметна. Гадоў праз дзесяць гэтая розніца сціраецца. Думаю, што розніца ва ўзросце мужа і жонкі павінна быць разумнай, гэта значыць, каб яны гаварылі на адной мове, разумелі адзін аднаго. Наогул, гэта самае важнае — каб было, пра што пагаварыць, каб былі агульныя інтарэсы і мэты.



Нявестка Алёна, сын Жэня і ўнук Даня.

***— Вы неяк сказалі, што экскурсавод — гэта артыст. І як турыст са стажам, пагаджуся з вамі. Зноў жа заўважаю, што ў некаторых экскурсаводаў утвараюцца фан-клубы турыстаў, а часцей турыстак. Ларыса не раўнавала?***

— Дык мы ледзь не разышліся! І справа не ў рэўнасці, а ў маёй адсутнасці дома. Уявіце: жонка нараджае, а я ў круізе, і забраць яе з радзільні мне не выпадае. Ларыса сказала: выбірай — сям'я ці работа. Абраў сям'ю: менш паездак, больш кабінетнай работы ў якасці начальніка аддзела Мінскага бюро падарожжаў і экскурсій. Не магу сказаць, што мне гэта лёгка далося, але ў сям'і трэба ўмець саступаць, лічыцца з тым, што важна для родных. А неўзабаве і Ларыса перайшла на работу ў бюро. Спярша была метадыстам, потым экскурсаводам.

***— Гэта таксама няпроста, часам бываюць незадаволеныя: маўляў, развялі тут «сямейнасць»...***

— Нас у гэтым не папракалі, на шчасце. Думаю, таму што Ларыса была добрым экскурсаводам. А калі ты прафесіянал, то чым цябе ўпікнуць? Мы не сядзелі ў адным кабінеце, усё роўна ездзілі, хай недалёка і ненадоўга, таму стомленасці адзін ад аднаго, маўляў, дома і на працы разам — у нас не было, мы нават паспявалі засумаваць.

**«Не магу сказаць, што мне гэта лёгка далося, але ў сям'і трэба ўмець саступаць, лічыцца з тым, што важна для родных».**

***— Як будуеце адносіны з вашым сынам?***

— Для кожнага ўзросту — свой падыход. Што я вынес з бацькоўскай сям'і: галоўнае, каб дзіця заўсёды адчувала, што яго любяць. Маленькаму чыталі казкі і спявалі калыханкі. Калі дзіця ў падлеткавым узросце, трэба здолець стаць яго сябрам, а дарослага не трэба вучыць жыць. Калі сыну патрэбна парада, ён сам спытае. Дзеці павінны пражыць сваё жыццё, набіць свае гузы. Кожнае пакаленне павінна жыць лепш — гэта таксама запаведзь маіх бацькоў. І калі б яны сёння былі жывыя, то радаваліся б і ганарыліся б сваім унукам.

***— Вы ўжо і самі дзед, Мікалай Арсенцьевіч. Як успрынялі новы статус?***

— Радасна! Нагнаў усё тое, што не паспеў з сынам. Па-першае, забіралі нявестку з радзільні цэлай дэлегацыяй: сын, я з жонкай, сваты. Ні з чым не параўнальнае шчасце трымаць на руках маленечкага чалавечка і разумець, што ён працягвае твой род. Калі прыйшоў час купаць унука, я захваляваўся: як гэта — пакласці яго ў пластыкавую ваннанчку? Я ж бачыў, як мая мама купала малодшага брата: у драўляныя ночвы сцяліла льняное палатно і на яго клала дзіця. Таму я настаяў, каб і для ўнука ў ваннанчцы ляжала нешта мяккае. Калі ўнук падрос, то трохі баяўся маёй барады, але калі прывык, мы з ім разам класна гулялі. Час праляцеў як адно імгненне: не паспеў азірнуцца — ужо павялі ўнука ў школу...

***— Семдзесят — час падвадзіць вынікі?***

— Хіба што папярэднія... А так у мяне планаў яшчэ гадоў на трыццаць!

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

Грані

# НЕ Ў ГРОШАХ ШЧАСЦЕ?

## Чым адрозніваецца мысленне багатых і бедных

**Напэўна, сцвярджэнне аб тым, што грошы — зло, любому сучаснаму чалавеку падасца абсурдным. Але, калі верыць псіхолагам, часта людзі падсвядома супраціўляюцца магчымасці выбрацца з галечы. Адкуль бяруцца «бяскрыўдныя» звычкі, якія прыводзяць да матэрыяльнай нястачы, і як пазбавіцца ад негатыўных установак, звязаных з фінансавым дабрабытам?**

### НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА...

«Я ўпэўнены, што галеча і багацце — якасці прыроджаныя. Адзін нараджаецца жабраком, другі — багатым. І грошы тут фактычна ні пры чым. Беднякі пры любых абставінах церпяць страты. Беднякоў пастаянна штрафуюць нават за тое, што іх сабака аправіўся ў неналежным месцы. Калі бядняк выпадкова губляе дробязь, то грошы абавязкова правальваюцца ў люк. А ў багатых усё наадварот. Яны знаходзяць грошы ў старых пінжаках. Выйграюць па латарэі. Атрымліваюць у спадчыну дачы ад малазнаёмых сваякоў. Іх сабакі ўдастойваюцца на выставах грашовых прэмій», — пісаў Сяргей Даўлатаў. Псіхолагі згодныя са знакамітым пісьменнікам: стаўленне да грошай сапраўды фарміруецца ў дзяцінстве. Багацце і беднасць можна лічыць якасцямі чалавека — праўда, не прыроджанымі, а набытымі, выхаванымі ў бацькоўскай сям'і.

І вось тут цытата, якую мы ўспомнілі, цалкам правамерная. Беднасць у першую чаргу ў галовах, а не ў абставінах, кажа псіхолаг і бізнес-коўч Вікторыя Кім. І часам дастаткова зірнуць на сям'ю, каб яшчэ да нараджэння дзіцяці прадказаць, будзе яно жыць у дастатку або ў пастаяннай матэрыяльнай неўладкаванасці.

### ЭКАНОМІКА ПАВІННА БЫЦЬ ЭКАНОМНАЙ

Калі вам злёгку за сорак, вы, напэўна, чулі гэту фразу, хоць, магчыма, ужо не ўспомніце, што яе аўтарства належыць Леаніду Ільічу Брэжневу. Фраза пайшла ў народ, і ў няпростыя перабудовачныя часы яе жартам і ўсур'ёз прамаўлялі ў самых розных абставінах. Гэтая фраза-ўстаноўка ілюструе адну з распаўсюджаных падсвядомых перашкод на шляху да матэрыяльнага дабрабыту.

— Калі ў вас мысленне беднага чалавека, то, сутыкнуўшыся з матэрыяльнымі цяжкасцямі, вы будзеце шукаць магчымасці скараціць свае выдаткі, адмовіць сабе ў яшчэ большай колькасці патрэб, «зацягнуць паясок». Калі ж у вас мысленне багатага чалавека, вы будзеце шукаць варыянты павышэння сваіх даходаў (дадатковыя крыніцы заробку ці, напрыклад, пасіўнага даходу), пашыраць свае прафесійныя кампетэнцыі або спрабаваць навучыцца таму, што запатрабавана больш, чым ваша спецыяльнасць.

Жаданне сэканоміць спараджае імкненне купляць па зніжцы. І вось вы імчыцеся на іншы канец горада, таму што «там зніжка». І зніжка невялікая, калі дадаць да кошту рэчы кошт праезду і змарнаваны час — на пошукі ў інтэрнэце зніжкі і падарожжа праз увесь горад.



— Тут можна ўспомніць і такія спосабы «эканоміць», як непатрэбныя пакупкі «па суперцане», і гарачы водгук на акцыю «дзве рэчы па цане адной», асабліва калі вам не патрэбна нават адна такая рэч, — адзначае суразмоўца. — І набыццё лішняй колькасці прадуктаў, якія ваша сям'я не паспявае з'ядаць да таго, як яны сапсуюцца, і купля круп або туалетнай паперы «на чорны дзень».

Для патэнцыяльна багатага чалавека найбольш каштоўны рэсурс — гэта час. Час такі чалавек выдаткоўвае на працу або вучобу, павышэнне кваліфікацыі, пошук новых крыніц даходу.

### ШТО НЕ З'ЕМ, ТОЕ ПАКУСАЮ

Мысленне беднасці мае і іншую грань, кажа псіхолаг. Гэта звычка жыць не па сродках. Такія людзі наогул адмаўляюцца ствараць хоць бы тоненькую фінансавую «падушку бяспекі» і жывуць нібы адным днём. Між тым, падкрэслівае спецыяліст, адкладаць усё ж трэба 10 % ад усіх паступленняў, нягледзячы ні на што.

— Тыя з людзей з мысленнем беднякоў, хто схільны жыць не па сродках, імкнуцца дэманстраваць знаёмым і незнаёмым сваю паспяховасць і заможнасць, — кажа псіхолаг. — Таму што больш за ўсё яны баяцца, што нехта вырашыць, быццам яны... бедныя. Гэта яны ў шкоду ўласнаму рацыёну харчавання купляюць «яблычны» айфон самай апошняй версіі. Гэта яны ладзяць вяселле «не горш, чым у людзей» (на сто пяцьдзясят чалавек у шыкоўным рэстаране) — зразумела, у крэдыт, хоць працэнтная стаўка сёння наўрад ці здольная парадаваць, а сумы пераплат выклікаюць здзіўленне. Гэта яны купляюць шыкоўную машыну, якую пасля выплат па крэдыце няма грошай заправіць. Зразумела, ёсць рэчы першай неабходнасці, без якіх не абысціся. Калі ў вас зламаўся халадзільнік і на дадзеным этапе купіць яго вы можаце толькі ў крэдыт — нічога не зробіш. Але купля ў крэдыт, дапусцім, велізарнай «плазмы» ці іншых прадметаў не першай неабходнасці — пагадзіцеся, не самае разумнае рашэнне. Асабліва ўлічваючы,



што падобныя рэчы не ліквідныя: ператварыць іх назад у грошы ў выпадку неабходнасці можна будзе толькі са значнымі стратамі.

Перш чым узяць крэдыт, адзначае суразмоўца, задайцеся пытаннем: калі вам не хапае матэрыяльных сродкаў сёння, адкуль яны возьмуцца заўтра, калі прыйдзецца рабіць выплаты банку?

Любоў да «халявы» — яшчэ адна грань мыслення бедняка. Гэтае імкненне ўзнікае ад падсвядомай упэўненасці, што ўсе навокал «павінны» вам за тое, што вам не шанцуе ў жыцці. Бясплатныя семінары, кнігі, трэнінгі — такі чалавек спампуе іх толькі за слова «бясплатна», але наўрад ці пацікавіцца зместам: мысленню беднасці дастаткова ілюзіі самаразвіцця замест рэальнага навучання. Імкненне да «халявы» прымушае такіх людзей усё рабіць «па знаёмстве», што атрымліваецца часта няўдала, а нярэдка і не танней за прафесійныя паслугі з пэўнай аплатай. І гэта яны ў атэлях Турцыі і Егіпта накладаюць велізарныя горы ежы на свае талеркі па прынцыпе «што не з'ем, тое пакусаю» і вязуць дадому атэльныя мыла і шампунь.

### ВЫЙСЦІ З ЗОНЫ КАМФОРТУ

Чалавек, асуджаны сваёй падсвядомасцю на беднасць, заўсёды адчувае страх страты таго, што ў яго ёсць, нават калі, па сутнасці, у яго нічога няма. Фетыш такіх людзей — «стабільнасць», хай нават гэта стабільна нізкія даходы і стабільная няўпэўненасць у заўтрашнім дні. Яны гатовыя ўсё жыццё працаваць на нелюбімай, нізкааплатнай рабоце і жыць ад палучкі да палучкі. Але паспрабаваць выйсці з зоны камфорту, рашыцца знайсці іншую работу, а тым больш змяніць сферу дзейнасці — не гатовыя. Бо рызыка прадугледжвае магчымасць пройгрышу, мяняць нешта страшна, а сініца — вось яна: хай дробная, але ў руцэ.

— Нават мінімальнай абароненасці чалавек з мысленнем беднасці аддае перавагу перад дзеяннем. Дзеянне звязана з рызыкай («Ці прыжывуся ў новым калектыве, ці спраўлюся з абавязкамі на новым працоўным месцы, ці здолею асвоіць новую сферу? Бо мне ўжо за 30, 40, 50»). І хай гэтая рызыка можа быць прыступкай на шляху да большай фінансавай свабоды — «разумней» пакінуць усё як ёсць. Аснова падобнай філасофіі — няўпэўненасць у сваіх сілах і нізкая самаацэнка. Плюс, зразумела, лянота і жаль да сябе.

Мысленне забяспечанага чалавека прымушае свайго «гаспадара» пастаянна шукаць шляхі росту дабрабыту, развівацца ў сваёй справе, шмат працаваць і трымаць руку на пульсе жыцця. Псіхолагі кажуць, што паспяховыя бізнесмены ўспрымаюць грошы не як мэту, а як сродак. Ім цікава зарабляць, пашыраючы з іх дапамогай свае магчымасці. Чалавек з мысленнем бедняка (для якога грошы — мэта) аддае перавагу нарміраванаму працоўнаму дню — з дзевяці да шасці, а вечары папросту забівае, утарапіўшыся ў экран тэлевізара і ад нуды едучы шкодную высокакаларыйную ежу.

Дарэчы, пра ежу... Здавалася б, якое дачыненне гэта мае да мыслення багацця ці беднасці?

— Самае прамое, — кажа псіхолаг. — Вы заўважылі, што забяспечаныя людзі эканомяць на сваім здароўі — у правільным сэнсе. Яны імкнуцца захоўваць здароўе, у тым ліку з меркаванняў эканоміі. Хвароба цягне за сабой страту працаздольнасці, а аднаўляць страчанае здароўе або проста падтрымліваць тое, што засталося, — гэта патрабуе сур'ёзных укладанняў, у тым ліку фінансавых. Лячыцца даражэй, чым надаваць час фізічнай актыўнасці і звяртаць увагу на тое, што вы ўжываеце ў ежу.

Кошт рацыёну — важны, але другарадны фактар, адзначае суразмоўца. І з бюджэтных прадуктаў можна скласці як здаровае, так і шкоднае меню.

— Лішняя вага негатыўна ўплывае не толькі на нашу знешнасць, але і на псіхалагічны стан. Уладальнік лішніх кілаграмаў часта становіцца непаваротлівым не толькі фізічна, але і псіхалагічна. І вось вы панура плывяце па цячэнні, а каб «дадаць жыццю фарбаў», радуеце сябе салодкім і фаст-фудам.

### ПАЧЫМ ФУНТ ЛІХА

Задайце сабе пытанне: ці сапраўды вы хочаце жыць у дастатку? Здавалася б, адказ відавочны. Але тут і крыецца праблема.

— Грошы прыходзяць да тых, хто іх не баіцца. Многія нашы суграмадзяне цягнуць гэтую боязь з савецкага мінулага: наша падсвядомасць памятае пра расстраляных буржуяў, рэпрэсіраваных нэпманаў, сасланых у Сібір «кулакоў»... І многія людзі падсвядома баяцца і не жадаюць грошай, хоць быццам бы менавіта пра іх і мараць. Такі вось парадокс.

У краінах Усходняй Еўропы, адзначаюць псіхолагі, многія дзесяцігоддзі культывавалася лжывае ўяўленне аб матэрыяльным дастатку, і мы прыцягнулі яго з сабой ужо ў трэцяе тысячагоддзе. У Англіі фунтамі мераюць стэрлінгі, у нас — ліха.

**Гэта яны ў атэлях Турцыі і Егіпта накладаюць велізарныя горы ежы на свае талеркі па прынцыпе «што не з'ем, тое пакусаю» і вязуць дадому атэльныя мыла і шампунь.**

— Вось абмежавальныя ўстаноўкі, якія вызначаюць мысленне беднага чалавека: «Ніколі не змагу добра зарабляць: я недастаткова ведаю і ўмею для гэтага», «Усім цяжка жыць», «Нічога ў мяне не атрымаецца», «Усё гэта не для такіх, як я», «Сумленна грошай не заробіш», «Багатыя людзі — без сораму і сумлення», «Не шанцуе мне». Сюды ж адносім «перлы» народнай мудрасці: «Лішнія грошы — лішні клопат»; «Багатаму не спіцца: злодзея баіцца»; «Багатаму чэрці грошы куюць», «Кожны павінен несці свой крыж». Гэтыя негатыўныя праграмы не даюць чалавеку дамагчыся поспеху, каб выбрацца з фінансавай ямы, колькі б сіл ён ні прыкладваў.

### ЗАКОНЫ ПРЫЦЯГНЕННЯ

Калі доўгія гады вашымі ўчынкамі кіравала мысленне беднага чалавека, змяніць устаноўкі на больш правільныя складана, але магчыма.

— Пачніце з прынцыпу думкі, што самі па сабе грошы — не зло, як і не дабро. Зло або дабро — у стаўленні да іх чалавека і ў тых мэтах, якіх ён з іх дапамогай дабіваецца, — кажа Вікторыя. — І цяпер цалкам лагічна будзе дакладна вырашыць, на якія мэты вам патрэбны сродкі. Маючы канкрэтную мэту (а не расплыўчатае жаданне «...а вось было б класна...»), вы падсвядома шукаеце магчымасці для яе ўвасаблення, у тым ліку матэрыяльныя.

Наступная думка, якую важна ўсвядоміць: калі вы цярпець не можаце тых, хто жыве ў дастатку, вам ніколі не трапіць у іх лік. Ваша падсвядомасць не дасць вам дасягнуць фінансавай стабільнасці — бо тады і вы апынецеся сярод тых, у каго «ні сораму, ні сумлення».

— Псіхіка сфармулюе наступныя ўстаноўкі, якія вызначаюць ваша жыццё: «Калі я стану фінансава забяспечаным, наўрад ці змагу сябе паважаць. А я гэтага не хачу. Людзі адвярнуцца ад мяне, а я гэтага не хачу. У багатых мноства праблем. Яны павінны кіраваць сваімі грашыма, а я не ведаю, як гэта рабіць. Яны — аб'ект зайздрасці. У іх бываюць праблемы з законам. Навошта мне праблемы? Пакуль у мяне няма грошай, я жыву спакойна». Гэты механізм працуе на здзіўленне выразна, не дазваляючы выйсці з зоны камфорту: вы «па аб'ектыўных прычынах» прапускаеце сумоўе для працаўладкавання, якое магло б адкрыць вам новыя прафесійныя і фінансавыя магчымасці, хварэеце на грып якраз падчас важнага жыццёвага этапу, губляеце выйгрышны латарэйны білет... Памяняйце ўстаноўкі — зменіцца жыццё. І, нарэшце, галоўнае, што трэба ўсвядоміць: матэрыяльны дастатак прыходзіць толькі да тых, хто гатовы працаваць для яго дасягнення. Прадумайце свае рэсурсы, крокі і канчатковую мэту. Складзіце канкрэтны план — на найбліжэйшы год, месяц, тыдзень і дзень. І штодня рабіце крок у вызначаным кірунку.

**Дзіяна РОНІНА.**

# ХТО Ў СЯМ'І ГАЛОЎНЫ,

## І ШТО ТАКОЕ КТУБА

**На зямлі беларускай не адно стагоддзе жывуць побач людзі розных нацыянальнасцяў. І мы заўсёды цікавыя адзін аднаму, з радасцю даведваемся больш пра ўклад жыцця і культуру сваіх суграмадзян. Сёння паразмаўляем пра яўрэйскія сямейныя традыцыі. Наш суразмоўнік — намеснік старшыні Бабруйскага іўдзейскага рэлігійнага таварыства, краязнаўца і аўтар шэрагу лекцый па яўрэйскай гісторыі Беларусі Алег КРАСНЫ.**



— У яўрэйскай традыцыі няма гендарнай роўнасці. Не тое што «адзін вышэйшы, іншы ніжэйшы», а «ёсць жаночыя абавязкі, ёсць — мужчынскія». Гэта не значыць, што мужчына не памые посуд, не значыць, што жанчына не будзе працаваць. Але ёсць такі закон: мужчына — гаспадар у сям'і, а жанчына — гаспадыня ў доме. Рэлігійны мужчына ў жыцці не спытае ў сваёй жонкі, чаму шторкі на кухні ружовыя. Яна вырашыла, што лепш ружовыя — значыць, ружовыя. Ён не будзе пытацца: «Чаму ты прыгатавала мне такі суп?» Таму што яна так вырашыла. Можна, вядома, папрасіць: «Вельмі хочацца дранікаў», але яна можа адказаць: «Яны па плане праз два тыдні».

Задача мужа — зарабляць, утрымліваць сям'ю, даваць дзецям адукацыю, вучыць іх маліцца і чытаць Тору. Задача жанчыны — трымаць дом, дапамагаць свайму мужу і выхоўваць дзяцей. Калі хлопчык раптам аказаўся невукам, яго маме ніхто і слова не скажа, прэтэнзіі будуць да бацькі. Але вось калі хлопчык дрэнна паводзіў сябе на вуліцы, маці даведаецца першай. Шмат што з гэтага захавалася і сёння. Муж можа быць вялікі начальнік ці равін, але дома ён падпарадкоўваецца правілам жонкі. Так, прылюдна яна не будзе рабіць яму заўвагі. Але гэта зусім не значыць, што дома ён не ўбачыць позу рукі ў бокі, як у паказы: «Мне пляваць, на якім баку ў цябе цюбяцейка!» І мужы не спрачаюцца з жонкамі. Ёсць такі жарт: «Кажуць, яўрэйскія сем'і лічацца больш моцнымі. Чыя гэта заслуга? Вядома, гэта заслуга яўрэйскага мужчыны. Таму што як мама яму ў дзяцінстве патлумачыла, хто ў доме галоўны, так ён жонку і слухаецца». Насамрэч гэта велізарная мудрасць. Мужчына не глядзіць на дом так, як жанчына. А яна бачыць не проста жыллё — ачаг. Не трэба лезці ў яе справы.

**«Паводзіць сябе ў сям'і трэба стрымана. Яўрэйскі мужчына павінен быць спакойным, удумлівым і сціплым. Нават калі ён вельмі заможны. У Талмудзе ёсць такое правіла: муж абавязаны ўтрымліваць сябе ніжэй за свае магчымасці, дзяцей — нароўні са сваімі магчымасцямі, а жонку — вышэй за свае магчымасці».**

Вядома, жанчына можа працаваць, але сямейныя абавязкі ніхто з яе не здымае. Пры гэтым хатняя гаспадыня — гэта вельмі паважаная прафесія для яўрэйскай сям'і. Калі дом у парадку, дзеці і муж добра дагледжаны, ніхто не спытае: «Чаму ты не працуеш?» А вось у адваротнай сітуацыі мужчыну дакладна не зразумеюць.

***— А як выбудоўваюцца адносіны паміж дзецьмі і бацькамі?***

— У яўрэйскай сям'і высока ставяць шанаванне старэйшых. Але асабліва моцна — шанаванне маці. Ёсць такі жарт: «Апошняе, што можа зрабіць яўрэйская жонка, — гэта спаборнічаць з яўрэйскай маці». А ўжо прыхільнасць жанчын да дзяцей перарастае ў жарты накшталт: «Яўрэйская мама так любіць сваё дзіця, што ў яе абдымках можна задыхнуцца» або «Чым адрозніваецца яўрэйская мама ад тэрарыста? З ім у прынцыпе можна дамовіцца» і г. д.

Цар, Бог і воінскі начальнік у сям'і — гэта дзіця. Як яўрэй песціць сваіх дзяцей, ужо стала пагалоскай. У сям'і не прынята сварыцца з дзіцем, мама ніколі не скажа сыну: «Додзік, ты дурань». Нават калі Додзік «адмачыў» поўнае глупства, яўрэйская мама скажа нешта накшталт: «Додзечка, сыночак, ты такі разумны хлопчык. Нават дзіўна, што такі разумны хлопчык зрабіў такое глупства». Дзяцей песцяць і вельмі любяць, але пры гэтым яўрэйскае паўналецце надыходзіць у дзяўчынак у 12, а ў хлопчыкаў у 13 гадоў. Пасля гэтага яны лічацца дарослымі і павінны цалкам адказваць за свае ўчынкі.

***— Якія рэлігійныя правілы паводзін ёсць у сям'і?***

— Паводзіць сябе ў сям'і трэба стрымана. Яўрэйскі мужчына павінен быць спакойным, удумлівым і сціплым. Нават калі ён вельмі заможны. У Талмудзе ёсць такое правіла: муж абавязаны ўтрымліваць сябе ніжэй за свае магчымасці, дзяцей — нароўні са сваімі магчымасцямі, а жонку — вышэй за свае магчымасці.

Але жанчына не абвешвае сябе каштоўнасцямі, апранаецца таксама проста. Пры гэтым яе сукенка можа быць пашытая з кітайскага шоўку, які каштуе даражэй, чым сабалінае футра. Таксама замужнія жанчыны ходзяць з пакрытай галавой.

***— Раскажыце пра асаблівасці яўрэйскіх вяселляў.***

— На традыцыйным яўрэйскім вяселлі ёсць заручыны і абрады. Напрыклад, маладыя знаходзяцца пад балдахінам, які абавязкова павінен стаяць на вуліцы. Гэта трэба для таго, каб Усявышні ўдзельнічаў у імпрэзе. Маці і свякроў сем разоў абводзяць нявесту вакол жаніха, чытаючы спецыяльныя малітвы. Сам шлюб — гэта прачытанне пэўнай малітвы, пасля чаго маладыя становяцца мужам і жонкай.

Муж надзявае пярсцёнак на ўказальны палец жонкі. Сэнс у тым, што калі яна будзе ўказваць яму гэтым пальцам, то ўспомніць, што яна замужам, і падумае, каму тыцкае. Можа, часам, гэтага рабіць не варта? Дарэчы, заручыцца можна было не толькі пярсцёнкам, але і любой рэччу, якая мае кошт. Хоць традыцыйна гэта пярсцёнак. Раней мужчыны не насілі іх, але цяпер усё змянілася.

Гуляюць вяселле мужчыны і жанчыны ў розных памяшканнях. Гэта зроблена для таго, каб добра павесяліцца, але не выглядаць нясціпла. Мужчына заўсёды павінен глядзець на сваю жонку, калі тая танцуе, а не на чужую. Дома можна танцаваць перад мужам, братам або бацькам. А на свяце трэба, каб дрэнныя думкі не лезлі ў галаву іншаму мужчыну, асабліва калі ўсе выпілі. Усявышні не сумняваецца ў прыстойнасці жанчын, тут хутчэй трэба адгарадзіць мужчын ад спакусы.

Ёсць цікавая традыцыя — насіць маладых на крэслах, як цара і царыцу. Нявесту носяць жанчыны, а жаніха — мужчыны. Лічыцца вельмі добрай справай у дзень вяселля атрымаць благаслаўленне ад маладых. Асабліва калі людзі хочуць ажаніцца або завесці дзяцей. У гэты дзень жаніх і нявеста ўспрымаюцца як пасланцы Усявышняга.

**«У яўрэйскай традыцыі няма гендарнай роўнасці. Не тое што «адзін вышэйшы, іншы ніжэйшы», а «ёсць жаночыя абавязкі, ёсць — мужчынскія». Гэта не значыць, што мужчына не памые посуд, не значыць, што жанчына не будзе працаваць. Але ёсць такі закон: мужчына гаспадар у сям'і, а жанчына гаспадыня ў доме».**

***— Што такое ктуба?***

— Гэта шлюбны дагавор, дзе прапісаны абавязацельствы жонкі і мужа адно перад адным. Тэкст ктубы старадаўні, у яго толькі ўпісваюць імёны жаніха, нявесты і рабіна. А таксама адступныя грошы. Гэта сума, якую муж абавязаны выплаціць жонцы ў выпадку разводу, калі разрыў адбываецца не па яе віне. Яе віной можа быць, напрыклад, здрада. Або калі ў сям'і 7 гадоў няма дзяцей. Дапусцім, муж не хоча разводзіцца з-за адсутнасці дзяцей. Тады сям'я захоўваецца. А вось калі адбылася здрада, ёсць цікавае правіла. Калі муж здрадзіў жонцы і яна гатовая яму дараваць, сям'я захоўваецца. А калі жонка здрадзіла мужу і ён гатовы ёй дараваць — у яго такога права няма, ён абавязаны развесціся. У гэтым ёсць глыбокі філасофскі сэнс. Нашы мудрацы добра ведалі людзей і разумелі, што мужчыны нясталыя. Вось яму стрэльнула нешта ў галаву, ён пагуляў, а потым будзе ўсё жыццё раскайвацца і маліць дараваць яму. Але калі жанчына здрадзіла мужу, то адбылося нешта страшнае, у аснове ляжыць нейкая вялізная праблема, і сям'я не адновіцца. Нашы мудрацы лічаць, што калі жонка здрадзіла мужу, ні яна, ні ён не змогуць з гэтым змірыцца.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

**«Цар, Бог і воінскі начальнік у сям'і — гэта дзіця. Як яўрэй песціць сваіх дзяцей, ужо стала пагалоскай. У сям'і не прынята сварыцца з дзіцем, мама ніколі не скажа сыну: «Додзік, ты дурань». Дзяцей песцяць і вельмі любяць, але пры гэтым яўрэйскае паўналецце надыходзіць у дзяўчынак у 12, у хлопчыкаў у 13 гадоў. Пасля гэтага яны лічацца дарослымі і павінны цалкам адказваць за свае ўчынкі».**

Лічба разводных грошай у дамове можа павышацца, калі нявеста прыйшла з багатым пасагам. Ктубу звычайна захоўваюць дома ў рамцы над ложкам. І калі мужу нешта не падабаецца, некаторыя жонкі кажуць: «Ідзі сюды, пачытай гэтую лічбу». У дакуменце прапісаны і абавязацельствы. У жонкі іх тры: паважаць мужа, утрымліваць дом у парадку і клапаціцца пра дзяцей. А абавязацельствы мужа перад жонкай — гэта велізарны тэкст, які абараняе жанчыну маральна і матэрыяльна. Людзі раней разумелі, што, калі жанчына няшчасная, сям'і не будзе.

***— Чаму нацыянальнасць перадаецца па жаночай лініі?***

— На гэтую тэму ёсць шмат думак і анекдотаў. Звычайна крытыкі іўдаізму ўспамінаюць народную версію: хто нарадзіў дзіця — дакладна вядома, а бацька і тата могуць быць рознымі людзьмі. У рэчаіснасці гэта проста гумар. Хоць верай у гэта грашаць нават многія гісторыкі. Яны спасылаюцца на часы рымскага валадарства, калі жанчыны падвяргаліся гвалту.

На самай справе закон ідзе з Торы. Яшчэ ад Абрагама і Сары. Усявышні абяцаў ім дзяцей, хоць яны былі пажылыя людзі. У Сары дзетародны ўзрост скончыўся, як яна сама казала: «У мяне спынілася звычайнае жаночае», гэта значыць, яна ніяк не магла мець дзіця. Але, разумеючы, як муж хоча дзяцей, дала яму ў наложніцы сваю служанку. І тая нарадзіла Абрагаму сына Ісмаіла, які стаў прабацькам арабскага народа (таму арабы заўсёды кажуць: «Мы для яўрэяў старэйшыя браты»). Абрагам яго песціў, таму што доўга чакаў наследніка (Абрагаму было амаль сто гадоў, калі гэта адбылося). Але тут пачынаюцца сямейныя разборкі. Жанчына, што нарадзіла дзіця, лічыць, што яна важнейшая за гаспадыню. Абрагам пакрысе прыгнятае Сару. І тут яму з'яўляецца анёл і кажа: «Не будзе Ісмаіл табе наследнікам, праз жонку сваю атрымаеш патомства сваё». Праз некаторы час Сара нараджае Ісака, ён становіцца прабацькам яўрэйскага народа. Па законах таго часу наследнікам быў старэйшы сын. Але тое, што Ісаак быў народжаны ад Сары (гэта значыць, ад першай яўрэйскай жанчыны), робіць наследнікам яго. З таго часу традыцыя такая, што маёмасць і прозвішча перадаюцца па бацьку, а яўрэйства — па маці.

Калі бацька яўрэй, а маці — не, то ў дзіцяці ёсць магчымасць прайсці гіюр. Гэта пэўны рэлігійны абрад пераходу ў яўрэйскі народ. Ён складаны і працяглы, можа займаць 2–4 гады, а можа — і 10 гадоў. Цікава, што, з пункту гледжання Галахі (яўрэйскага закона), чалавек, у якога 3/4 яўрэйскай крыві, такі ж неяўрэй, як любы рускі, казах ці туркмен. А вось калі ў яго ўсе сваякі не яўрэі, акрамя мамы (гэта значыць, захавана жаночая ніць), то дзіця яўрэй на 100 %.

**Валянціна БЫСТРЫМОВІЧ.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Агролизинг», 220005, г. Минск, ул. Красная, 13-31, +37517-242-13-81** |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Наименование (Назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Административное помещение** (Административное помещение) по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 4-1Н | 884 кв. м | 500/D-70779533 |
| | Обременение: частичная аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by | | |
| | **Начальная цена с НДС 20 % – 1 014 057,14 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)** | | |
| 2 | **Торговое помещение** (Торговое помещение) по адресу: г. Борисов, ул. Строителей, д. 26, пом. 5 | 1672,1 кв. м | 610/D-47661 |
| | **Начальная цена с НДС 20 % – 880 952,38 доллара США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)** | | |

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001. Нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 30 рабочих дней после проведения аукциона и, при необходимости, получения согласия антимонопольного органа на экономическую концентрацию

В случае признания победителем аукциона либо единственным участником, согласившимся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на пять процентов, хозяйствующего субъекта, до совершения сделки, может потребоваться согласие антимонопольного органа (Министерства антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь) на экономическую концентрацию

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена **в течение 30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи и, при необходимости, получения согласия антимонопольного органа на экономическую концентрацию

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение по лоту № 1 опубликовано в газете «Звязда» 06.10.2020 г., по лоту № 2 – 31.05.2019 г.

**Аукцион состоится 07.06.2021 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.**
**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 03.06.2021 до 17.00 по** указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8044-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19** |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Наименование (Назначение) | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1 | **Административно-хозяйственное здание с пристройкой** (здание административно-хозяйственное), общей площадью 895,2 кв. м, инвентарный номер 500/С-2686, по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34 | **2 713 633,21** белорусских рублей |
| | **В состав лота входит иное имущество, размещенное на сайте организатора торгов www.cpo.by** | |
| | **Сведения о земельном участке пл. 0,3112:** предоставлен на праве временного пользования по 30.04.2025 для обслуживания здания административно-хозяйственного | |
| 2 | **Экструзионная линия** модели «FCL 21/SH PRO-CAST» Dolce (сер. № UZ0014/04, изготовитель – BIELLONI CASTELLO spa Италия, инв. номер нф00028) с холодильным оборудованием № 1 (Model: D 500/4/LE Serial № 280815201510511100, изготовитель: EURO-CHILLER s.r.l. – ITALY, инв. номер нф 00027) | **948 600,00** белорусских рублей |

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 5 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 60 календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона по лоту № 1 опубликовано в газете «Звязда» от 14.04.2021 г., по лоту № 2 – 17.02.2021 г.

**Аукцион состоится 20.05.2021 г. в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.**
**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 18.05.2021 до 17.00 по** указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Утерянные страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ №№ 1323960, 1348082, страховой сертификат, удостоверяющий заключение договора страхования «Зеленая карта» серии BY/12/ № 18837072, страховой полис по договорам страхования, заключаемым с физическим лицом (формы РН), юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (формы РП) по страхованию иному, чем страхование жизни формы 2РН, 2РП серии БК № 0399517 филиала СООО «Асоба» в г. Минске № 2 **считать недействительными.**

УНП 100706519

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир» (продавец) извещает о проведении 21 мая 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 80 % (лот № 1); на 55 % (лот № 2) по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Местонахождение имущества:** г. Гомель, ул. Войсковая, 16 | | |
| **1** | **Двигатель TSI 1,8 куб. см и КПП** (для автомобиля SKODA OCTAVIA), 2012 г. в., состояние удовлетворительное, пробег – 311 546 км. Адрес: г. Гомель, ул. Войсковая, 16 | **660,00** | 33,00 |
| **2** | **Автопогрузчик ДВ 1792, 1991 г. в.,** 59 613 моточасов. Состояние удовлетворительное (погрузчик не эксплуатируется). Двигатель дизельный | **3 415,50** | 170,78 |

**Продавец:** ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир», г. Гомель, ул. Севастопольская, 106.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (0232) 25-49-97, 8 (033) 372-87-77 – начальник транспортного цеха Туманов Александр Николаевич. **Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир»):** р/с BY86 BLBB 3012 0400 0783 1600 1007 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНН 400078316, БИК BLBBBY2X, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 6 мая 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 19 мая 2021 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.**

